ДУК «Шаркаўшчынская ЦБС»
Аддзел бібліятэчнага маркетынгу

# Спрадвечныя назвы зямлі Шаркаўшчынскай

## (легенды і паданні аб паходжаннях населенных пунктаў раёна)

Кожнае беларускае паселішча мае непаўторны лёс і адметную гісторыю, цесна звязаную з сацыяльна-эканамічнай гісторыяй краіны. Кожная назва напоўнена глыбокім гістарычным сэнсам.

Для ўстанаўлення паходжання назваў былі задзейнічаны шматлікія разнастайныя крыніцы: геаграфічныя, гістарычныя, этнаграфічныя, фальклорныя, энцыклапедычныя, літаратурныя творы і сучасная перыёдыка, вусныя сведчанні мясцовых старажылаў і інтэрнэт-рэсурсы.

Матэрыял можа быць выкарыстаны бібліятэкарамі для правядзення масавых мерапрыемстваў краязнаўчага характару, а таксама настаўнікамі і вучнямі для заняткаў гуртка па краязнаўству, класных і інфармацыйных гадзін.



# Легенды і паданні аб паходжанні вёсак



## Агальніца

Назва паходзіць ад слова “голы”, з якога бачна, што пасяленцы былі беднымі людзьмі. Да вайны была самая вялікая вёска – 55 двароў. У вайну была спалена. У 60-х гадах (старшынёй быў Кірыленка) быў пабудаваны млын і піларама. Можна было малоць зерне, вальцаваць муку і абдзіраць на крупы. Стаяла свая электрастанцыя, якая прыводзілася ў рух судавым рухавіком.

## Алашкі Малыя

Па версіі былога гісторыка Слабадской СШ Зарэцкага Л.І. магчыма , тут калісьці жылі продкі татар, якія маліліся свайму Богу Алаху. Адсюль і назва – Алашкі.
Вёска Алашкі Малыя з’яўляецца радзімай І. П. Сікоры. Тут размешчаны музей памяці Сікоры і яго сядзіба.
Побач з музеем расце 130-гадовы дуб, пасаджаны Сікора Аляксандрам. Ёсць запісана цікавая легенда пра яго пасадку.

### Легенда пра пасадку дуба

Дуб пасаджаны у 1880 годзе Сікора Аляксандрам. Помнік культуры, ахоўваемый дзяржавай.

Падрастае волат-дуб у нашай мясцовасці. Вядома, пакуль яму не зраўняцца па велічы і ўзросту з белавежскім, але ў нашай мясцовасці - гэта самае магутнае дрэва. Затое мы ведаем, хто яго пасадзіў, а таксама ўстанавілі яго ўзрост. А расказалі нам пра гэта мясцовыя старажылы Сікора Мікалай ды ўнук таго, хто пасадзіў дрэва, Сікора Яўген. І вось, што яны распавялі. Дзеда звалі Аляксандрам. Калі ён ажаніўся – то з другімі мужчынамі ў яго быў, так бы мовіць, заклад: пасадзіў Аляксандр у сябе на сядзібе дуб, сасну ды яблыню і загадаў, што будзе ў яго сын і дзве дачкі. А было гэта, прыкладна, у 1880 годзе. Дата дакладна не вядома, але вызначаецца па наступных прыкметах…У грамадзянскую вайну, у 1918-1920-х гг. на сасне, бо дуб рос памалей, быў наладжаны польскі назіральны пункт. Палякі з гэтага назіральнага пункта ў Малых Алашках сачылі за чырвонармейцамі, якія ў той час стаялі ў Рымках. Як расказваў Мікалай Сікора, на сасну быў усцягнуты “кругляк” і яны, дзеці, потым забаўляліся на гэтым назіральным пункце. Па тым, што дрэва ў той час у вёсцы Алашкі было найвышэйшае, можна меркаваць, што было тады тром дрэвам не менш за сорак гадоў. Гэта падцвярджаюць і гады нараджэння дзяцей у сям’і Аляксандра. Такім чынам, праведзенае даследаванне дазваляе зрабіць вывад аб тым, што пасаджаны дуб у 1880 годзе.




Споўнілася мара Аляксандра: нарадзіліся ў сям'і дзеці дачка Марыля ды Анюта і сын Ягор. Ішоў час, дрэвы раслі, а разам з імі падрасталі і дзеці. Дочкі павыходзілі замуж. Пры бацьку застаўся толькі сын Ягор. Яблыня аказалася дзічкай і мела нясмачныя церпкія плады, ад яе застаўся толькі пень. Незайздросны лёс напаткаў і сасну, яе галлё так разраслося, што стала перашкодай пры правядзенні лініі электраперадач. І сасна была спілавана. У дуба ж толькі паабразалі галлё і зараз ён упрыгожвае ўсё наваколле. Шэфствавала над дубам мясцовая Слабадская школа, пасля яе закрыцця за дубам даглядаюць супрацоўнікі музея імя І.П. Сікоры. Дуб агароджаны. На агароджы надпіс: хто і калі пасадзіў дрэва, а таксама папярэджванне аб тым, што гэта помнік культуры і ён ахоўваецца дзяржавай.

Дарэчы дуб знаходзіцца побач з сядзібай Івана Паўлавіча Сікоры і ўсяго на пяць гадоў старэйшы за яго (Іван Паўлавіч Сікора нарадзіўся ў 1885 годзе). І мы з гонарам можам сказаць: “Пад гэтым дубам любіў адпачываць Іван Паўлавіч”. Цікава, што прозвішча Сікора таксама ўспамінаецца ў радаводнай кнізе Уладзіміра Ліпскага як старажытны шляхецкі род. Нажаль, пакуль няма такога чалавека, які б змог дакапацца да дзесятага калена ў знакамітым родзе Сікораў.

Ідзе час, разносіцца па наваколлі насенне дуба-волата, яшчэ шырэй распаўсюджваюцца знакамітыя гатункі Сікоры. І хочацца верыць, што гэты дзіўны тандэм волата-дуба і чалавека-садавода захаваецца ў нашай памяці як сімвал велічы, чысціні, непадуладнасці часу, адзінства чалавека і прыроды.

Мы ўсё ляцім і ляцім у бязмежнай касмічнай прасторы. Мы маленькія іскрынкі сусвету, якія загараюцца толькі на адно імгненне. Застаецца толькі попел ды пні.

І толькі два скарбы ўзвышаюць чалавека над вечнасцю: памяць і дзеці.

## Баяршчына

Назвы гэтай вёскі пайшла ад слова “баярын”, што азначае багаты чалавек.

Але так думаюць не ўсе. Ёсць і такое меркаванне.

Жылі тут некалі людзі, якія любілі ўзяць тое, што дрэнна ляжыць (значыць, злодзеі). Кралі часцей за ўсё авечак. Тут усё проста: украў, зарэзаў ды з’еў. Вось і разбярыся, дзе чыя авечка, куды яна падзелася.

Аднаго разу пайшлі злодзеі ў суседнюю вёску авечак красці, а людзі пільнавалі іх ўжо даўно. Чуюць людзі такую гамонку: “Возьмем па барану дый дадому”, - кажа адзін. Другі не згаджаецца і шэпча: “Па ярцы, па ярцы”, - што значыць па авечцы. І так яны заспорылі, што аж крычаць сталі: “Па ярцы! Па ярцы!” А тут гаспадары выскачылі ды давай іх лупіць: “Вось вам па ярцы, вось вам па ярцы!” Потым і сталі іх называць паярцамі, Паяршчына, а потым Баяршчына.

Некаторыя сцвярждаюць, што назва вёскі паходзіць ад слова “яр” – глыбокая канава. Ішлі па дарозе, жабруючы, дзед і баба.

Баба была сляпая, але вельмі злосная. І упартая. Яна не бачыла дарогі, а як толькі дзед адкрывае рот, каб сказаць ёй, што гразь там ці што, а яна ўжо крычыць: “Дурачына, маўчы!” Вось ідуць яны да вёскі, а наперадзе глыбокі яр, поўны вады. Думае дзед: “Трэба бабу папярэдзіць, а то ўтопіцца”. Толькі адкрыў рот: “Ба, яр!” , а баба ўжо бух у тую канаву з галавой. Вынырнула на хвіліну і крыкнула: “Чына”. І не стала бабы. Пайшоў бедны дзед у вёску і ад хвалявання і роспачы пачаў гаварыць, заікаючыся “Ба-яр-чына”. Вось так і да нашага часу гэта назва захавалася.

## Верацеі

З даўніх часоў насельніцтва вёскі займалася не толькі паляваннем ды рыбнай лоўляй, але і вырабам верацён. Свой тавар яны вязлі на продаж ў бліжэйшыя гарады. Гэтых людзей празвалі верацейшчыкамі, а мясцовасць назвалі Верацеі.

Назва "Верацеі" лічылася як участак зямлі сярод лесу. На адным з такіх участкаў і пасяліліся людзі, і назвалі яны сваю вёску Верацеі. Праз некалькі гадоў па-суседству на пустым участку пабудавалася яшчэ адна вёска. І назвалі яе таксама Верацеі. А каб чым-небудзь вёскі адрозніваліся, людзі першую вёску назвалі Верацеі І, а другую- Верацеі ІІ.

*(Запісана ад Грыдзюшка Інны Раманаўны, (1930 г.н.)*

## Вялікае Сяло

У памяці старажылаў захаваліся звесткі аб вёсцы Вялікае Сяло. Гэта было вялікае пасяленне, якое мела вялікі шлях паміж Дзісной і Глыбокім. Нават ёсць звесткі, што па гэтаму шляху ішлі французскія войскі. Каля ракі ёсць курган, дзе пахаваны французы.

Пры польскай уладзе раздавалася зямля і людзі пачалі будаваць хаты, сталі жыць аднаасобна, па хутарах. І ўжо ў канцы 30-ых, калі Заходняя Беларусь уз'ядналася з Усходняй, пачалі арганізоўвацца арцелі. Першая арцель была арганізавана 30 снежня 1949 года. Жыхары в.Вялікае Сяло, Шышкі, Шылкі, Крапіўнікі, Яблонка, Пузаны і хутароў сталі будаваць свае хаты ў цэнтры арцелі і назвалі вёску Вялікае Сяло. Вёска і сапраўды стала "вялікай" і назва звязана з арганізацыяй арцелі.



*Вёска Германавічы. 1923 год*

## Германавічы

Упершыню мястэчка Германавічы згадваецца ў 1563 годзе. Назва вёскі пайшла ад імя аднаго з першых жыхароў гэтых мясцін – Германа.

### З гісторыі вёскі Германавічы

Мястэчка Германавічы ўпершыню згадваецца ў 1563 г. У 1579 г. яно адзначана на карце Пахалавецкага. Першапачатковымі ўладальнікамі маёнтка былі Сапегі, якія ў 1739 г. прадалі іх барону Экель фон Гільзену, які ў 1782 г. прадае іх свайму пратэжэ графу Ігнату Шырыну. Паводле Жыхлінскага, сям'я Шырынаў харвацкага паходжання, якая ў XVI ст. пасялілася ў Венгрыі.

Ігнат Шырын (пам. 10.08.1796г.) атрымаўшы ад бацькі толькі дзве маленькія вёскі, аддаўся ў апеку заможнаму тады Юзефу Гільзену, уладальніку вялікіх багаццяў, інфлянцкаму кашталяну, мсціслаўскаму ваяводу, якому быў абавязаны адукацыяй і кар’ерай. Стаўшы ў Гільзенаў добрым вучнем, разбагацеў на гэтулькі, што быў у стане купіць у 1782 годзе Германавіцкі ключ, які складаўся з мястэчка Германавічы і фальваркаў Падоршчына, Белы Двор, Прамяны і Марыямполь. Яго жонка Марыяна Якубоўская адкупіла пасля ад паноў маёнтак Парэчча. Набыўшы пасля іншыя ўладанні Ігнат Шырын пакінуў сваім дзецям багацці ў некалькі мільёнаў злотых. Акрамя таго, атрымаў шмат узнагрод і іншыя пасады: у 1765 г. быў прызначаны конюхам браслаўскім, годам пазней - габрэлеўскім старастам, а ў 1768 г. - паслом на сейм з Браслаўскага павета. У 1775 г. быў гарадскім суддзёй Браслаўскага павета, а ў 1786 г. быў выбраны дэпутатам у Галоўны Трыбунал Вялікага княства Літоўскага. У 1792 г. атрымаў ордэн Святога Станіслава.

За сваю галоўную сядзібу Ігнат Шырын выбраў Германавічы. Там ён збудаваў парафіяльны касцёл, прызначаны адначасова пад сямейную ўсыпальніцу, дзе і быў пахаваны разам са сваёй жонкай. Касцёл быў збудаваны ў 1787 г. у стылі віленскае барока і захаваўся да нашых дзён. І сёння ён упрыгожвае нашае мястэчка сваімі архітэктурнымі якасцямі.

Чатыры сыны Ігната Шырына далі пачатак чатыром лініям, названымі як атрыманыя ў спадчыну маёнткі: юзэфоўскай, парэцкай і падорскай. Германавічы з фальваркамі атрымаў трэці сын Ігната - Юстын Шырын (пам. у 1852г.) дзісненскі падкаморый, які купіў ад Віктара Юндзіла Шудзілеўшчына, ад брата Антона – Антопаль. Пабудаваў, ці толькі закончыў у пачатку XIX ст. пачаты бацькам палац, а таксама збудаваў капліцу святых Пятра і Паўла, у якой і быў пахаваны. На жаль, гэтыя капліцы (філіяльны касцёл) да нашых дзён не захаваны.

З трох сыноў Юстына Шырына старэйшы Дамінік памёр нежанатым, сярэдні – Напалеон, атрымаў Шудзелеўшчыну, Германавічы, Марыянполь, Прамяны; Антопаль і Парэчча дасталіся малодшаму сыну Аляксандру., жанатаму са стрыечнай сястрой з парэцкай лініі – Канстанцыяй Шырын. Адным з апошніх уладальнікаў Германавіч і застаўшыхся багаццяў, быў сын Аляксандра – Уладыслаў Шырын (нар. у 1847г.), жанаты на Вікторыі Кажанеўскай, а пазней іх патомства апошнім уладальнікам маёнтка быў граф Антон Шырын, які памёр у 1938 г.

На пачатку XX ст. на месцы сучасных Германавіч было 2 мястэчкі: Старыя і Новыя Германавічы. Старыя Германавічы ўваходзілі ў склад Стэфонпольскай воласці Дзісненскага павета, а Новыя - ў склад Лужкаўскай воласці Дзісненскага павета. Толькі пасля далучэння гэтай тэрыторыі да Польшчы, мястэчкі былі аб’яднанымі ў адно і сталі цэнтрам гміны. У 1900 г. адбыўся вялікі пажар, пад час яго згарэла палова мястэчка. У гэтым вогнішчы загінуў Петрапаўлаўскі касцёл, які, на жаль, больш не аднаўляўся. Гэта быў цікавы помнік архітэктуры, збудаваны ў стылі класіцызму, а сцены і скляпенні былі распісаны ў форме ілюзіямістычнага жывапісу. Касцёл адначасова выкарыстоўваўся пад сямейную ўсыпальніцу Шырынаў.

Сяляне мястэчка жылі ў даволі складаных умовах. У большасці яны былі малазямельнымі, працягваў захоўвацца абшчынны лад жыцця. Сельская гаспадарка не забяспечвала цалкам усіх патрэб сялянства, таму ў вольны час яны займаліся рознымі рамёствамі. І яны лічылі, што менавіта рамёствы і даюць ім магчымасць пражыць.

Рэвалюцыйныя падзеі, што адбываліся цалкам па краіне, далі пра сябе ведаць і ў Германавічах. 13 ліпеня 1902 г. каля Дзісны адбывалася сходка працоўных. Паліцэйскім удалося заўважыць месца сходкі. Было затрымана 25 чалавек. Сярод затрыманых былі і жыхары Германавіч. Часам здараліся пагромы панскіх маёнткаў, млыноў.

Не абышла бокам Германавічы і Першая Сусветная вайна. У выніку наступлення германскіх войск, якое пачалося 18 лютага 1918 г., Германавічы аказаліся ў зоне акупацыі кайзераўскіх войскаў. Жыхары вёскі рассказваюць, што немцы неслі свой парадак, наладжвалі дысцыпліну. Аднавяскоўцы ўспамінаюць, што ў Германавічах акрамя нямецкіх салдат, знаходзіўся аўстрыйскі полк, многія салдаты якога добра гралі на скрыпках. Адзін селянін зачараваны музыкай вырашыў свайго сына навучыць іграць на скрыпцы. Ён купіў у аўстрыйскага салдата скрыпку, якая зараз знаходзіцца ў музеі мастацтва і этнаграфіі імя Язэпа Драздовіча.

Знешні выгляд вёскі Германавічы на пачатку стагоддзя быў вельмі непрывабны. На ўсю вёску было толькі 2 студні. Хаты былі пераважна курадымнымі (без коміна). Усюды было брудна, ніхто ніколі не прыбіраў вуліц. Германавічы былі абнесены вялікім плотам з брамай. Бальшак ішоў якраз цераз панскі двор. У 21 гадзіну вечара брама зачынялася і ў вёску пазней нельга было трапіць, як нельга было з яе і выйсці.

У 1912 г. Германавічы гарэлі зноў. Пасля пажару моцна пацярпеў графскі палац. Ён страціў першапачатковы інтэр'ер, які больш не быў адноўлены.

Дакацілася да вёскі і рэха грамадзянскай вайны. Пад час савецка-польскай вайны 1919-1920 гг. Германавічы па некалькі разоў пераходзілі з адных рук у другія. Аб гэтых падзеях апавядае пісьменнік М. Машара ў кнізе "Ішоў дваццаты год". Героі гэтай кнігі – рэальныя асобы, што пражывалі ў Германавічах і ваколіцах.

Па ўмовах Рыжскага мірнага дагавору 18 сакавіка 1921 г. да Польшчы адыходзіла значная частка Беларусі – 113 км. з насельніцтвам звыш 4 мільёнаў чалавек. Вёска Германавічы таксама апынулася ў складзе Польшчы.

Пад час польскай акупацыі, Германавічы былі невялікім мястэчкам, цэнтрам гміны. Тут у асноўным пражывалі сяляне і гандляры – габрэі. Насельніцтва было шматнацыянальным і шматканфесійным. Тут мірна ўжываліся каталікі, іўдэі і стараабрадцы; беларусы, палякі, рускія і літоўцы.

У 1925 г. казна адкупіла ў пана Шырына за 35 тысяч злотых яго палац для школы. У ёй дзеці вучыліся да 80-ых гадоў XX ст., пакуль не была збудавана новая школа. Гэта школа дала цэлы шэраг дзеячоў польскай культуры: Эдвард Кісель – першы мітрапаліт Беластоцкі; Вацлава Кашчынская і Тэостын Рэтт-Жэброўскі– прафесары універсітэта Марыі Кюры-Складоўскай.

Падаўляючая большасць жыхароў мястэчка не была беднай, але багатай таксама не была. Яны валодалі падзеламі зямлі, хатай, лаўкай, гродам, рамесленай майстэрняй. Працаваць на зямлі даводзілася шмат і праца не была лёгкай. Але большасць сямей без хлеба не сядзела. Мястэчка Германавічы знаходзілася ў аддалённым кутку Віленскга ваяводства, адчувала сваю адсталасць. Знаходзілася яно далёка ад чыгункі і іншых шляхоў зносін з больш буйнымі культурнымі, эканамічнымі, палітычнымі і навукова-прамысловымі цэнтрамі краіны. Не было тут электрычнасці і прамысловасці.

Але з цягам часу жыць у Германавічах станавілася лягчэй. Былі задумы правесці з Шаркаўшчыны да Германавіч чыгунку, далей на Дзісну. Вялася праца па адкрыцці новых маршрутаў з Шаркаўшчынай, Дзісной, Браславам, Друяй і іншымі гарадамі.

З 1935 года вяліся работы па паглыбленню русла ракі Дзісны, ачысткі дна ад камянёў і валуноў, ліквідацыі мелі. Рыхтавалася лінія параходства Шаркаўшчына – Дзісна. Усё засталося не рэалізаваным. І Германавічы і надалей працягваюць знаходзіцца ў баку ад шляхоў зносін.

У час Вялікай Айчыннай вайны ў Германавічах стаяў паліцэйскі гарнізон. Немцаў было мала, толькі некалькі чалавек. Германавічы ўваходзілі ў партызанскую зону, тут на балотах Багна-Мох дыслацыраваліся: 4 партызанскія брыгады, 7-ы смаленскі полк, брыгада імя Чапаева, імя Калініна, і “Кастрычнік”; заходзілі сюды і партызаны брыгады “Спартак”. У 1943 г. прыйшлі разведчыкі Чырвонай Арміі да Арсенія Дземенцьева. Органы НКВД праз брата яго Івана, які служыў у Савецкім войску, устанавілі сувязь з Арсеніем. У якасці пароля яны прыслалі ліст ад Івана, які прасіў дапамагчы іншым разведчыкам. Просьбу брата Арсеній выканаў: паказваў броды, варожыя мацаванні, перавозіў праз Дзісёнку ў патаемным месцы. У той час лепшыя жыхары Германавіч пайшлі ў партызаны.

Апошнія гады дажываў у Германавічах Буда Фёдар Васільевіч, які раней жыў на адным з астравоў на балоце Багна-Мох. Ён быў партызанскім сувязным, разведчыкам, праваднікам. Фёдар Васільевіч выратаваў ад знішчэння 7-ы Смаленскі полк. Карміў, паіў, даваў прытулак партызанам. Немцы яго схапілі, звезлі ў Германавічы ў канцлагер. Адтуль ён звярнуўся зусім сляпым.

У верасні 1943 г. немцы арганізавалі аблаву на моладзь. Юнакоў вылаўлівалі ўсюды: і дома, і ў лесе, на полe, у дарозе, а потым звозілі ў Германавічы. Там іх, некалькі соцен юнакоў і дзяўчат, заганялі ў вялікі хлеў. Былая ўдзельніца гэтай жудаснай падзеі, Ніна Аляхновіч рассказала: “Мне было ўсяго 14 год, калі мяне схапілі немцы. Ішла ў журавіны з братоўкай, босая ў адной сукенцы. Схапілі і прывезлі ў Германавічы, змясцілі ў вялікі хлеў. Усе гласілі, крычалі. Галасіла і я, размазваючы слёзы па твары. Пераначавалі. Назаўтра злітаваўся нада мной адзін канваір і сказаў: “Выпушчу цябе на сваю патрэбу, а ты ўцякай хуценька”. Толькі ён мяне выпусціў за дзверы, а там мая маці з сумкай стаіць. Заплакала, запрычытала яна і дае канваіру сумку, той кажа “Уцякай хутчэй!”. Але на мамін крык выйшаў другі канваір, схапіў мяне за каршэнь. Даў пінка і ўкінуў у хлеў. А назаўтра павезлі нас у Шаркаўшчыну, а адтуль цягнікам у Нямеччыну.”

1 чэрвеня 1944 г. воіны 1406-га зенітна-артылерыйскага палка 39-й дывізіі рэзерву Галоўнакамандуючага вызвалі вёску Германавічы.

У жніўні 1949 г. у Германавічах створаны калгас “Мічурын”. Першым старшынёй быў Лагун Аляксандр Францавіч. Пасля яго, гэты пост заняў Высоцкі Васіль Казіміравіч, удзельнік французскага супраціўлення, працаваў да верасня 1952г. У верасні 1952г. адбылося узбуйненне калгаса. У выніку аб’яднання калгасаў “Зара”, “Мічурын”, “Новае сяло” названы новы калгас быў імя Мічурына, старшынёй быў абраны Глушын Броніслаў Антонавіч. У час старшынства Глушына, у калгасе была ўсяго адна машына і тая старая, трактароў, камбайнаў не было. За гэты час у Германавічах быў пабудаваны адзін хлеў. Не было электрычнасці. У 1955г. старшынёй быў выбраны Малугін Фёдар Пятровіч, працаваў 4 гады. За гэты час было набыта 2 аўтамашыны. Кожан Ларыса Аляксандраўна ўзначальвала калгас 3 гады. У сувязі са знішчэннем Шаркаўшчынскага раёна калгас імя Мічурына быў названы “Буравеснікам”. У Германавічах была МТС, з якой была утворана РТС і калгас “Буравеснік” набыў тады 4 трактары ДТ-54 і адзін трактар Беларусь. Майстэрні МТС сталі ўласнасцю калгаса. З 1 сакавіка 1961 па 1964 г. старшынёй працаваў Грыцкевіч К.Т. За гэты час калгас набыў трактар Беларусь, адну аўтамашыну, камбайн. На пачатак 1967г. у калгасе было 10 трактароў, 3 камбайны, 2 бульбакапалкі, 2 бульбасажалкі. 10 снежня 1965г. у калгасе была закончана электрыфікацыя калгаса. У 1965г. быў пабудаваны новы мост праз Дзісёнку.

З красавіка 2004 г. калгас “Буравеснік” увайшоў у склад СПК “Княж”, які зараз узначальвае Будо Уладзімір Пятровіч.

Германавіцкі сельскі Савет быў утвораны 12 кастрычніка 1940 г. Зараз на яго тэрыторыі размешчаны 47 населеных пунктаў, у якіх пражывае 2986 чалавек. Дзейнічаюць Германавіцкая участковая бальніца, амбулаторыя, аптэка і 3 ФАПЫ.

На тэрыторыі сельскага Савета размешчаны Германавіцкая, Зоркаўская сярэднія школы, Вялікасельская школа-сад, дзіцячы сад-яслі. У цэнтры вёскі Германавічы ўзвышаюцца два помнікі 18ст.рымска-каталіцкі касцёл, і графскі палац. Створаны музей этнаграфіі і быта Язэпа Драздовіча. У 20-я гады Язэп Драздовіч, прыязджаючы да маці сваёй Юзэфы Янаўны, якая арандавала зямлю ў Красоўшчыне і фальварку Лявонаўка, пасябраваў с многімі жыхарамі Германавіч і навакольных вёсак і шмат карыснага зрабіў на нашай зямлі. Арганізаваў дзве бібліятэкі, пачатак якіх злажыў сваімі кнігамі.

У 2003 годзе у цэнтры Германавіч пачынае дзейнічаць праваслаўная царква, працуе Дом культуры, бібліятэка, Дом ганчара, лясніцтва, комплексны прыёмны пункт камбіната бытавога абслугоўвання, аддзяленне сувязі.

Сёння у Германавічах пражывае 630 чалавек, з іх дарослых 430 чалавек, дзяцей 140, састарэлых (больш за 70 гадоў) – 55 чалавек.

2006 год з’явіўся для Германавіч абнаўляючым. Вёска паспяхова ператвараецца ў аграгарадок. Пакладзены тратуары, заасфальтаваны вуліцы, пастаўлены новыя цэментныя платы. Больш прывабнымі сталі жылыя хаты і вуліцы. Адрамантаваны будынак школы, Дом культуры, амбулаторыя, музей, дзіцячы садок. Абноўлены тарговы цэнтр вёскі. Чысціня і парадак становяцца адметнай рысай сучаснага сяла.

2013 год юбілейны для нашага мястэчка Германавічы. Сваё 450-годдзе жыхары адсвяткавалі ўдала і ўрачыста.

Стала традыцыяй праводзіць свята “Купалле.”. У цэнтры мястэчка, на даволі высокім пляцы, усталёўваецца сцэна для выступлення артыстаў. А супраць яе - ўтульная альтанка для гледачоў, якая захоўвае ад сонца і дажджу. Мясцовы святар, ксёндз Ян, прымае самы актыўны ўдзел у мерапрыемстве. Напрыканцы святочнае вогнішча азарае роднае мястэчка Германавічы.

Жыццё мястэчка год ад года становіцца цікавейшым. Кожная арганізацыя ўносіць свой пасільны ўклад.



## Грыблы

Назва вёскі паходзіць ад слова “грэбла”, што азначае высокае, ніколі не затапляемае месца. І сапраўды, вёска знаходзіцца на ўзгорку. З паўночнага боку да яе падступае балота, а з паўднёвага працякае рэчка Быстрыца.

## Грыгараўшчына

Калісьці, вельмі даўно, на гэтым месцы былі лясы з ягадамі і грыбамі, але яно было вельмі глухое, таму чалавек баяўся сюды заходзіць, бо думаў, што тут ёсць “благія” духі. Нават, самыя смелыя людзі абыходзілі гэтае месца.

Аднойчы сюды трапіў землеўладальнік Рыгор (Грыгор), якому расказалі аб тым, што гэта месца небяспечнае. Але Грыгор быў вясёлвм і смелым чалавекам. На папярэджваннілюдзей ён адказваў, што пры дапамозе працы, добрых учынкаў і шчырага сэрца ён зробіць гэта месца для ўсіх прывабным.

Хутка з’явілася вялікая хата з  гаспадарчымі пабудовамі. Працаўнікі Грыгоро пачалі апрацоўваць гэтыя землі. Сонейка пачало сюды часцей заглядваць, а аднойчы яно прынесла прыгожую дзяўчыну. Яе блакітныя вочы дарылі ўсім добры настрой. Грыгор закахаўся ў Ганну. І сталі яны жыць на гэтай зямлі разам. Жылі дружна і шчасліва. Але ў хуткім часе хвароба адняла ў Грыгора Ганну. Хлопец, поўны смутку і гора, вырашыў пакінуць гэту зямлю. У імя Ганны ён пабудаваў царкву, а змлі раздаў сялянам.

З тых часоў Грыгора ніхто не бачыў. Царквы той ужо няма, а вёска, якая назва ад Грыгора—Грыгараўшчына – ёсць.

## Жукоўшчына

Мясцовыя жыхары тлумачэння назвы вёскі не даюць. А вось В.А. Жучкевіч у сваім “Кратком топонимическом словаре” тлумачыць паходжанне такой назвы ад асновы жук. Вёска з’яўлялася цэнтрам калгаса “Іскра”, які аб’яднаў дзевяць калгасаў-вёсак. Як цэнтр мела ўсю сацыяльную інфраструктуру: магазін, дзіцячы садок, бібліятэку, пошту, комплексны прыёмны пункт і нават бальніцу.

## Зямцы

Назва вёскі азначае, што тут жылі пасяленцы на земшчынных землях, выдзеленных на памежных калісьці землях (16-18 ст.).

## Ігуменава

Гэта было даўно, яшчэ за прыгонам. Ля рэчкі было даволі шырокае поле, і сяляне сеялі там гарох. А рака ў той час была, напэўна, шырэйшай, глыбейшай. Па ёй цягалі баржы і сплаўлялі лес. Да нашага часу захавалася назва месца, якое завуць “Румск”. Дык вось аднойчы (людзі як раз сеялі гарох) раптам лінуў такі дождж, што ў момант вада змыла пасевы, а рака выйшла з берагоў і амаль наблізілася да вёскі. Людзі ў роспачы не ведалі, што рабіць. Вада, здаецца, кіпела, а людзі, што былі  на плытах, гінулі. Ніхто не мог уратавацца. Лівень не сунімаўся ніколькі і здавалася, нічому не будзе ўжо паратунку, але раптам ударыў пярун, а чорная хмара нібы раздваілася, і хтосьці ўбачыў, як з яе выйшла жанчына ўся ў чорным і пачала павольна апускацца на зямлю. Страшэнны вецер ірваў на ёй адзежу, а дождж заліваў яе. І вось яна, нарэшце, апусцілася на зямлю. Вецер зараз жа сціх, дождж перастаў і з-за хмар выглянула сонца. Той, хто ўбачыў жанчыну першым, стаў клікаць вяскоўцаў паглядзець на дзіва. Калі людзі прыбеглі на бераг рэчкі, на тое месца, дзе чалавек убачыў жанчыну, яе там ужо не было, а толькі мокрае адзенне, усё парванае ветрам. Гэта было адзенне манашкі. Яно ляжала на беразе. Людзі тады зразумелі, што з неба з’явілася Іегуменння ім на выратаванне. Пагэтаму і вёску, а потым і мясцечка, называлі Іегуменава. На месцы, дзе знайшлі адзенне манашкі, людзі збудавалі каплічку, бралі з таго месца зямлю, лічылі, што яна валодае незвычайнай сілай і прыносіць людзям шчасце, дае здароўе. Прайшло шмат часу, зруйнавалі людзі каплічку – і абрынуліся на людзей шмат нягот і няшчасцяў. Тады людзі паступова сталі пакідаць гэтае месца. Так і знікла гэтае мястэчка.

## Іёды

Вёска Іёды атрымала імя ад слова  “jodas” , што па – літоўску азначае “чорны лес”.

### Гістарычная даведка пра вёску Іёды

У 1866 годзе ў Іёдах было 25 дамоў, пражывала каля 160 чалавек. Іёдская воласць уключала тады ў свае межы 78 вёсак, у якіх налічвалася 544 дамы і пражывала 4592 чалавекі. У далейшым у сувязі з войнамі колькасць жыхароў і дамоў у Іёдах змяншалася.

Да Вялікай Айчыннай вайны у Іёдах быў 261 двор, пражывала 610 жыхароў. У час нямецка-фашысцкай акупацыі было знішчана вельмі многа дамоў, а суседнія вёскі Куштали і Трабаўшчына спалілі разам з жыхарамі. 500 мірных іёдскіх жыхароў яўрэйскай нацыянальнасці расстралялі і замучылі ў 1942 годзе.

Пасля вызвалення тэрыторыі Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў галоўнай задачай стала аднаўленне сельскагаспадарчай вытворчасці.Сяляне, згодна з дзяржаўнымі планамі, аб’ядноўваліся ў калгасы. У 1949 годзе быў арганізаваны ў Іёдах калгас” 1 Мая”. Старшынёй быў абраны Недзведзь Альфонс Іванавіч. Спачатку гаспадарка была невялікая, мелася 30 кароў, 56 свіней, 20 працоўных коней. У 1950 годзе набылі першую аўтамашыну. У райцэнтры Шаркаўшчына была створана МТС, якая абслугоўвала калгасы сельскагаспадарчымі машынамі, трактарамі, камбайнамі.

Палепшыліся ўмовы жыцця калгаснікаў. У 1966-67 гадах пачалося будаўніцтва жылых духкватэрных дамоў і сельскага Дома культуры. Потым былі пабудаваны пошта, будынак сельскага Савета, амбулаторыя, бібліятэка, бальніца на 25 ложкаў, магазін,комплексна прыёмны пунк камбіната бытавога абслугоўвання, лясніцтва.

З 1973 года старшынёй калгаса “1 Мая” быў абраны Мядзелец Вадзім Андрэевіч, які яшчэ выконваў абавязкі дэпутата Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Плошча і структура сельхозугоддзяў складала 2267га., пашня 405 га. Вырошчвалі 120 гектараў бульбы, 90 га лёгу, 700 га зернявых, 50 га кукурузы, 40 карняплодаў.

У 1980 -1984 г.г. у Іёдах з’явіліся новыя вуліцы: Палявая, Крынічная.

Калгас “1Мая” пераўтварыўся ў сельскагаспадарчы вытворчы кааператыў””Іёды” (СВК).

У чэрвені 2007 года пачалося будаўніцтва аграгарадка Іёды. Зараз у аграгарадку пражывае 425 чалавек.

# Казакі

Гэтыя падзеі здарыліся пры прыгоне. Паны-памешчыкі лютавалі, служкам сваім над сялянамі здзекавацца дазвалялі, але і апошнія, часам, не вытрымлівалі — паўставалі. Тады ўжо помсцілі да апошняй кроплі крыві, нікога не шкадавалі — ні паноў саміх, ні іхніх жонак, ні дзяцей.

У нашых мясцінах быў адзін надзвычай люты пан. Звалі яго Звяздоўскі. Хто яго ведае, дзе карані радаводу гэтага памешчыка былі. Адно людзі ведалі дакладна: што прыехаў ён сюды ці то з польскай, ці то з рускай службы. Як пасяліўся, дык адразу пачаў свае парадкі наводзіць. Ледзь толькі што не па-ягонаму атрымаецца, то загарлае:

— Слугі! Да мяне!

Тыя ляцяць, баяцца, каб на іх саміх панскі гнеў не выліўся.

Кіруйце па палетках, па нівах-сенажацях ды назірайце, як мужыкі працуюць. Не шкадуйце іхніх спін, не жальцеся над жонкамі ды дзецьмі, бо яны такія самыя мужыкі, не паспееце адвярнуцца — яны на зло што-небудзь учыняць.

Выканаем, шаноўны пане, — адказвалі тыя і імчалі выслужыцца перад лютым гаспадаром.

Сам Звяздоўскі звычайна заставаўся ў маёнтку і там загадваў катаваць самых непаслухмяных вяскоўцаў. Сам абавязкова пры пакаранні прысутнічаў ды яшчэ і здзекаваўся:

— Чаго ж ты, родненькі, крычыш? Ты спявай, спявай! А двум здаравенным служкам, якія за ім, нібы здані, паўсюдна хадзілі і ўсе ягоныя загады выконвалі, казаў:

— А вы яму дайце добра. Дайце, каб мала не падалося.

Тыя стараліся. Так давалі, што за якіх пару хвілін душа з беднага сялянскага цела адлятала высока, у недасягальную для Звяздоўскага мясціну, бо, каб мог, то ён бы і душы людскія катаваў.

Так працягвалася, казалі, гадоў дваццаць. Сяляне трывалі, маліліся, каб Бог забраў хутчэй з гаротнай зямлі гэткага вылюдка, але Усявышні не надта спяшаўся выконваць людскія просьбы: ці то якія справы яшчэ больш неадкладныя былі, ці то не меў сілы звесці яго з зямлі. Як бы там ні было, але памешчык адчуваў сябе на гэтай самай зямлі галоўнай істотай.

І вось неяк вяскоўцы з аднае невялічкае вёсачкі сабраліся ў прыцемках (баяліся днём, каб хто з панскіх паслугачоў не заўважыў ды не падслухаў, а потым гаспадару не данёс) і давай раіцца, што далей рабіць, бо болей так жыць не маглі.

-- Няхай ужо лепей усіх, разам з жонкамі і дзецьмі, закапаюць жывымі ў зямлю, чым так пакутаваць. Да каня ці да вала намнога лепей адносяцца, чым пан да нас. Мала таго, што лупцуюць кожны дзень, дык на сваю сям'ю не даюць магчымасці папрацаваць.

— На памешчыка гнешся, гнешся, а сваім дзецям і з'есці няма чаго.

— Трэба, браткі, нешта рабіць.

— А што тут зробіш?

Усе замаўчалі. Ведалі, што далей трываць нельга, але і пэўнага выйсця не бачылі. І тут раздаўся адчайны голас:

— Чаго сцішыліся?! Што, зноў пагамонім і разыдземся, а ён будзе паранейшаму над намі здзекавацца?!

— Чаго ты крычыш?

— Бо надакучыла маўчаць!

— То прапануй.

— Я і хачу сказаць — давайце бунтавацці

— Не выйдзем на працу, ці што?

— Не, у лес падамося.

— А сем'і?

— З сабой забяром.

— А жывёлу: коней, каровак, авечак?

— А многа іх у нас? Што тычыцца будынкаў, то і спалім, каб у ліхія рукі не дасталіся. А ў лесе... У лесе не будзем сядзець спакойна, а прыгадаем панам ды падпанкам, як яны з нас здзекаваліся.

— Во гэта справа! На такое мы згодны!

Калі памешчыку данеслі, што згарэла цэлая веска і жыхароў нідзе няма, дык ён, асабліва не задумваючыся, адказаў:

— А туды ім і дарога.

Але праз некаторы час пачаў шкадаваць, што не разабраўся, не даў веры, бо ўсе навакольныя маёнткі згарэлі. Паноў-падпанкаў мноства перабілі, перавешалі. І ягоных слугаў амаль не засталося. Калі Звяздоўскі пачынаў патрабаваць, каб сяляне больш спраўна працавалі, то сяляне ўжо не схілялі моўчкі галовы, адусюль чуліся, праўда, яшчэ не ў поўны голас, гнеўныя галасы:

— Пачакай, пачакай, і на цябе яшчэ казакі знойдуцца...

І знайшліся такі. Падпільнавалі лясныя жыхары ліхога пана, калі той ля рачулкі прагульваўся. Нават і піскнуць не паспеў, як ужо калыхаўся на высокай асіне.

Лягчэй стала сялянам жыць, бо тыя паны, якія пазней сюды прыязджалі, ужо не так люта адносіліся да людзей. А жыхары той вёсачкі, якія ўцяклі, так і засталіся жыць сярод адвечнага лесу, а пра іхняе адважнае мінулае нагадвала толькі дзіўная назва, якая назаўсёды засталася з імі, — Казакі.

## Клінавое

Размясцілася вёска Клінавое, як бы на вялікай паляне, сярод лесу. Бытуе такая версія, што назву вёска атрымала ад слова “клін”. Нельга роўна падзяліць надзелы зямлі, усе атрымоўвалася клінамі. У XIX стагоддзхі веска размяшчалася бліжэй пад Верацеі. У пачатку XX стагоддзя свае хаты жыхары сталі будаваць бліжэй да Умшка (так і зараз завецца балоцістая мясцовасць). Зямля тут больш пладавітая, вільготнасці больш. А тое месца, дзе раней была вёска, зараз называецца Старыцай.

**(***запісана ад Крыўко Ірыны Лук'янаўны, в. Клінавое, 63 гады***)**

## Крапіўнікі

Было гэта вельмі даўно. Вёску акружаў лес, а ў нізіне было шмат сажалак. У гэтых сажалках сяляне разводзілі рыбу, лавілі яе і аддавалі пану. Рыбы было шмат, а найбольш карпаў.

Едзе аднойчы праз вёску рызнік, бачыць, што на беразе сажалкі шмат карпаў ляжыць, а сяляне з сеткамі яшчэ ловяць.

Прывітаўся рызнік: “Здарова, карпіўнікі” – што значыць, лаўцы карпаў. А тыя адказалі” “Не карпіўнікі мы, а крапіўнікі, бо як толькі вясна настане, то і харчуемся лебядой ды крапіўкай, а карпаў толькі тады і бачым, як ловім”.

Паглядзеў на іх рызнік і падумаў: “І праўда, крапіўнікі, толькі скура ды косці тырчаць”.

Вось з тых часоў і вёску называюць Крапіўнікі

## Кукаўка

На месцы, дзе цяпер наша вёска стаіць, даўней раслі адвечныя, таўшчэразныя дубы, якія здзіўлялі падарожных ды праезджых людзей сваёй таўшчынёй і вышынёй. Як ні дапытваліся яны, у чым прычына, сяляне часцей за ўсё маўчалі, а калі і адказвалі, то з гэтых адказаў нічога нельга было зразумець, адчувалася нейкая недамоўле-насць.

Найбольш кемлівыя пачыналі дапытвацца цішэй:

— Калі не хочаце, то і не кажыце, раз вы ўжо гэтую таямніцу нам адкрыць баіцеся. Дубы вашы ад гэтага меншыя не зробяцца, і вам горай не стане...

— Стане, — выдыхалі тады местачкоўцы.

— Незразумела гаворыце...

— Справа ў тым, што мы свае дубы... слязьмі і крывёю пастаянна паліваем...

— Слязьмі і крывёю?

— Так. Толькі паблізу ад нашых мясцін нікому пра тое, што зараз пачуеце, не распавядайце, каб наш памешчык не даведаўся, бо тады канец усім нам будзе.

— Што, такі суровы?

— Нават не тое слова...

І расказвалі звычайна адчо і тое ж паданне ці, дакладней, відаць, гісторыю.

Усімі навакольнымі абшарамі валодаў мясцовы памешчык. Мала таго, што ён быў люты і сквапны, дык яшчэ і сляпы, праўда, не ад нараджэння. З тым вылюдкам спрабаваў было адзін адчайны чалавек разлічыцца, ды не атрымалася да канца, толькі зроку ваўкалака пазбавіў.

Была ў таго хлапчыны каханка. Прыгожая дзяўчына, працавітая. Не адзін на яе заглядваўся, але яна да пчаляра мясцовага хінулася, да Мартына. Так яны і сябравалі, так і хадзілі ўсюды ўдваіх. Збіраліся жаніцца. А пан наш, ёнтады таксама малады быў, увёў такі закон: дзяўчына, якая замуж выходзіць, павінна першую ноч не з мужам правесці, а з памешчыкам. І людзі выконвалі і маўчалі, бо паспрабуй голас падаць — галава на плячах не ўтрымаецца.

Калі пачуў пан, што Мартын жэніцца і бярэ сабе ў жонкі тую самую прыгажуню, якую ён даўно на прыкмеце меў, то ажно зарагатаў і нагамі затупаў ад задавальнення:

— Нарэшце... Нарэшце... Значыцца, сёння я з ёю ўсю ноч пацешуся...

Ягоны рогат падтрымалі шматлікія слугі, і панесліся дзікія крыкі ды рогат за вокны жахлівага палаца.

— Збегайце, папярэдзьце яе, каб не марнавала час, крыху раней прыходзіла. Шапніце, што я даўно жадаю яе. Калі будзе мяне слухацца, дык багатыя падарункі атрымае. Зямлі дам, лесу... Азалачу. Так і скажыце.

Слугі пабеглі, а з памешчыкам застаўся толькі верны войт.

— Што вы, пане? Навошта ёй гэтулькі багацця даваць?

— А хто дае?

— Дык вы ж...

— Я? Эх, войце, адно слова — сказаць, а зусім іншая справа — выканаць. А ты падумаў...

— Было, пане.

І зноў абодва зарагаталі. Але смяяліся яны, як аказалася, рана. Неўзабаве прыбеглі пасланыя слугі і яшчэ ад парога залапаталі наперабой:

— Пане... Пане... Не слухаецца...

— Хто? — ажно прыўстаў гаспадар.

— Дзяўчына. Сказала, што і чуць пра вас не жадае, не тое што з вамі спаць.

— Прывалаклі б сюды адразу!

— Там гэты... Як яго...

— Мартын? І вы збаяліся?

— Ён біцца пачаў.

— Звязаць і абодвух да мяне ў пакоі! Я ім пакажу, ганарліўцам, як мае загады не выконваць! Яны ў мяне паскачуць!

На гэты раз колькасць слуг была значна большай, і праз некаторы час Мартына з каханкай прывалаклі ў палац.

— Дык, кажаш, са мной спаць не жадаеш?

— Не!

— Зараз я пры тваім жаніху зраблю сваю справу і ніхто мне не перашкодзіць, — прамовіў пан і падаўся да дзяўчыны.

Тая адчайна баранілася, крычала, але нічога зрабіць не змагла... Гаспадар, задаволены, узняўся і прамовіў:

— Вось і ўсё. Адпусціце іх.

Маладых адпусцілі, але, як аказалася, зрабілі гэта зарана, бо Мартын выхапіў здаравенную паходню з рук аднаго са слуг і скочыў да памешчыка. Задушыць пана ён не паспеў, але здолеў выпаліць злыдню вочы. І сам загінуў у палацы. А ягоная каханка ўцякла.

Пасля таго, як аслеп, памешчык прызвычаіўся хадзіць на паляванне. Дзіўна, але страляў трапна, па слыху.

Так ён паляваў на птушак, а да людзей ужо не чапляўся, за імі сачылі падпанкі. Але неяк да яго прывялі жанчыну і сказалі, што гэта тая самая каханка Мартына.

Усхадзіўся пан:

— На гэты раз ты ў мяне паскачаш!

— Не палохай. Не баюся я цябе, — горда прамовіла жанчына.

— Пабачым!

— Ты ўжо не пабачыш.

Загадаў памешчык той жанчыне залезці на дуб як мага вышэй і кукаваць, а сам адышоўся на патрэбную яму адлегласць і стрэліў у тым напрамку. Жанчына мёртвай упала з дуба.

Але знайшлося ліха і на памешчыка. Аднаго разу, калі ён павёў у лес сваю чарговую ахвяру, здаравенная галіна дуба ўпала прама на злыдня. Там ён і згінуў, ніхто яго не даставаў.

Мясцовасць тую назвалі Кукаўкай. Пазней там веска ўзнікла, наша веска.

## Лужкі

Падчас вайны 1812 года праз нашы мясціны баявыя дзеянні пракочваліся двойчы: першы раз, калі рускія адступалі, а другі раз, калі ўжо адступалі французы. Дык ад таго першага разу і засталася назва невялічкага паселішча, якое ўзнікла якраз там, дзе стаяла вялізнае войска Напалеона. Паслухайце, як усё адбывалася.

Пра тое, што пачалася вайна, мясцовыя жыхары даведаліся са спазненнем. Па-ранейшаму займаліся гаспадарчымі справамі, ды неяк і не заўважылі, што глухія іхнія мясціны, кудою і за месяц ніякі вершнік ці экіпаж не праязджаў, зрабіліся больш ажыўленымі. Сталі з'яўляцца вайсковыя вершнікі, якія, праўда, не гаманілі ні з кім, а толькі пілі, разгарачаныя, ваду са сцюдзёнай крыніцы і праз імгненняў колькі да слыху даносіўся звонкі пошчак капытоў. Ніякіх буйных атрадаў ці партый тут пакуль што не наглядалася. Усе тыя ганцы былі адзіночныя.

Сядзелі неяк вяскоўцы на прызбе і гаманілі. Дзень яны адпрацавалі, нарабіліся ўволю і зараз быў самы той момант, калі можна было даць адпачынак стомленаму целу. Гаворка лянотна перакочвалася з адной тэмы на другую, заціхала і зноў ускіпала. Мужчыны разыходзіцца не спяшаліся. Не надта часта выпадалі такія хвіліны, каб сабрацца разам ды перакінуцца словам-другім. Вось тут і прагучала нечаканае пытанне:

– А што гэта вершнікі ўсё ездзяць праз нашу вёску?

– Ага, мае дзеці кароў пасвілі, дык гаварылі, што ў іх коннік дарогі пытаўся...

– Наш ці што?

– Не тое, каб наш, але расеец, бо дзеці ж зразумелі пытанне.

– Нешта тут не тое робіцца... Каб было ў каго запытацца...

– У нас тут і людзей такіх няма.

– Чаму няма? Ёсць.

– Хто?

– Ды салдат... Той, што некалі да нас прыбіўся пасля заканчэння службы.

– Думаеш, ён нешта ведае?

– Ён жа былы вайсковец, можа, пра нешта і здагадваецца...

– А дзе ён зараз?

– Ля хаты корпаецца. Калі я сюды ішоў, то вітаўся з ім, - адказаў адзін вясковец.

Натоўп паволі пасунуўся ў накірунку патрэбнай сялянам хаціны. Сапраўды, салдат яшчэ не закончыў сваю працу і падладжваў плот. Заўважыўшы людзей, кінуў усё і стаў чакаць.

– Слухай, братка, - звярнуўся да яго той самы селянін, які задаваў пытанне пра вершнікаў, - чаго гэта вершнікі тут так часта насіцца сталі?

– Каб жа я ведаў...

– Бачыш, і ён нічога не ведае, - азваліся астатнія.

– Але ж ты ў войску служыў. Павінен хоць нешта адчуваць адносна ўсяго гэтага...

– Адчуваць? Ды вы сядайце, чаго стаіце. Паспрабуем разам разабрацца, што тут магло здарыцца.

– А ты, чалавеча, мяркуеш, што нешта здарылася?

– Хутчэй за ўсё. Ганцы за проста так не сталі б насіцца.

– І якая можа быць прычына? – асцярожна запытаўся стары дзед.

– Вайна, можа, дзе пачалася, - выдыхнуў салдат і зацягнуўся едкім дымам з глінянай трубачкі.

– Вайна?

– Яна, браце. Калі дзе якая бітва ці войска ідзе, то веставых-коннікаў не злічыць.

– З кім жа вайна ў нас можа быць?

– Ды ці мала з кім. Ім не сядзіцца, а салдацікі гаротныя кроў сваю праліваюць.

– Ракою... – прамовіў салдат і вочы ягоныя затуманіліся, відаць, прыгадаў сяброў-таварышаў, якія засталіся на шматлікіх палях бітваў.

– Як жа ўсё ж даведацца?

– Калі сюдою войскі пойдуць, то адразу даведаемся, а калі не, то пашанцуе.

– Чаму?

– Бо спаляць, вынішчаць усё. Там жа не сотня-другая людзей пройдзе, дзесяткі тысяч. Можаце ўявіць, што тут будзе рабіцца...

– А што ж нам рабіць, салдат, каб уратавацца?

– Давайце зараз усе разам і вырашым. Я прапаную перайсці жыць куды ў іншае месца. Самі выратуемся і сем'і свае выратуем. Жывёлу пазабіраем, а ўсё, што ў хацінах лепшага ёсць, пахаваем. Можа, будынкі не будуць паліць, а калі і спаляць, дык адбудуем. Галоўнае, каб людзі жывыя засталіся.

– Ведама што. Так і зробім.

Перабраліся людзі пасля тае размовы жыць у глухую пушчу. Месца выбралі такое, што і сам чорт не знайшоў бы, не тое што чужынцы. Паступова супакоіліся, прызвычаіліся. Есці было што, а да астатняга сялянам не прывыкаць. Потым нехта данёс чутку, што вайна пачалася. Нават у пушчу цягнула дымам.

– Усё навокал паляць. Добра, што мы здагадаліся ўцячы, а то і нам такое ж было.

Паслалі разведчыкаў праверыць, ці ёсць ворагі на месцы былой вёскі. Тыя неўзабаве вярнуліся і сказалі, што агромністы лагер стаіць якраз там, дзе некалі любілі касіць сена, - на лугах.

Калі французаў прагналі, то вяскоўцы выбраліся з лесу, але пасяліліся не на старым паселішчы, а там, дзе быў лагер непрыяцеля, бо надта многа ўсялякага дабра, патрэбнага ў гаспадарцы, пакідалі там французы. А вёску тады назвалі Лужкамі, што між лугоў стаіць.

*(З кнігі "Віцебшчына ў легендах і паданнях". – Мн.: Беларусь, 2000. – С. 448 – 450).*

# Ляднікі

Жылі-былі дзед і баба. Так ужо здарылася, што пабраліся яны тады, калі ў дзеда жонка памерла, а ў бабы той муж сканаў. Таму было ў іх двое дзяцей, дзве дачкі: бабіна — Насцёна, і дзедава — Алёна. Яны імкнуліся кожны свайму дзіцяці дапамагаць, і неяк незаўважна баба пачала ў хаце гаспадарыць. Дзедава дачка стала ёй упоперак горла, з-за таго і сварыліся, бо дзед ведаў сваю Алёну, што ніякая яна не лайдачка, а ўжо прыгажуня — то пашукаць яшчэ такую ж.

Баба ўпікала дзеда:

– Як ты сваю дачку любіш. Хвіліны не пройдзе, каб не пахваліць. Але, было б каго.

– А то не?

– Вырасла нейкая караўка...

– На сваю паглядзі лепей.

– Мая самая, што ні на ёсць, прыгажуня!

– Ага, толькі людзей надвячоркам і палохаць такой прыгажуняй...

– Затое мая працавітая! Вось!

– Я ж табе ўжо казаў, якая яна працавітая.

– Давай тады праверым!

– Давай.

Неяк, паспрачаўшыся, вырашылі дзед з бабай адправіць дачок у лес, па чарніцы, і паглядзець, хто больш спраўны да працы.

Павячэралі і ляглі спаць. Але гаспадыня яшчэ доўга не спала, было чуваць, як яна пра нешта шапталася з Насцёнай. Суцішыліся толькі тады, калі дзед спецыяльна кірхануў.

З самага рання гаспадар сказаў дзяўчатам:

– Пойдзеце па чарніцы. У лес. Хочам паглядзець, хто з вас больш увішная да працы, а то ў нас спрэчкі з-за гэтага ўзнікаюць. Праверым раз і назаўсёды.

– Пойдзем, — адказалі дочкі і моўчкі сталі збірацца. Дзіўна было, што Насцёна, якая звычайна супрацівілася, аднеквалася, тут маўкліва пагадзілася.

Стары, праўда, нічога не сказаў, толькі глянуў чулліва на Алёну, маўляў, дакажы, даражэнькая, не падвядзі. Дачка прыжмурыла вочы і ўсміхнулася. Гаспадару адразу ж стала лягчэй на сэрцы, бо дачка зразумела ўсё правільна. Гаспадыня, дык тая прамовіла, да Насцёны звяртаючыся:

– Не забудзь, дачушка, што я табе вечарам казала...

– Не, матуля, усё памятаю і ўсё так зраблю.

Пайшлі дочкі ў лес і зайшлі даволі далека. Туды, куды не хадзілі вясковыя жанчыны браць чарніцы, бо баяліся, каб лесавік іх там не закружыў ці каб якое іншае ліха не здарылася. Гэтым жа двум хацелася натрапіць на нябраныя ягады.

Нарэшце знайшлі такія ягады — буйныя, як боб, толькі і бяры. Алёна як узялася, дык адразу ў пасудзіне палова стала, а Насцёна — адну ягадзіну ў рот, а адну ў пасудзіну.

Час ляцеў непрыкметна, і недзе адразу пасля паўдня Алёна сказала:

– Мне ўжо час дамоў вяртацца.

– Чаго гэта так рана?

– Ды браць няма куды болей. Поўную каробку сваю набрала, трэба вяртацца.

Тут Насцёна зразумела, што прайграла, але прыгадала тое, чаму яе навучыла матуля.

– Не спяшайся, давай пасядзім крыху. Адпачнём і потым дамоў рушым, усё роўна яшчэ ранавата.

– Давай, — пагадзілася Алёна.

Каб жа яна ведала, што задумала зласліўка Насцёна, дык ніколі на такое не пагадзілася б. Селі яны ля сцяжынкі і вырашылі падрамаць якіх з паўгадзінкі. Алёна заснула, а Насцёна лупянула яе па галаве цурбалкам і зарагатала:

– Вось і ўсё табе! Цяпер не будзе выхваляцца твой татачка, што ты намнога лепшая за мяне. Не будзе скаліць зубы, што я лайдачка ды няўмека. Цяпер табе зямля сырая вочы закрые...

Мала гэтага, перасыпала ягады з Алёнчынай каробкі ў сваю і паджгала дахаты. Маці яе ўзрадавалася:

– Вось бачыш, якая мая дачушка!

– А дзе ж Алёна? — пачаў дапытвацца бацька.

– Ды яна са мной не хадзіла. Асобна падалася, відаць, каб мяне перагнаць. Толькі не атрымалася, я больш спраўнай аказалася...

Паснулі ўсе ў хаце, а стары гаспадар не спаў, ніяк не ішоў да яго сон, усё здавалася, што нешта тут не тое. Але дзе ж ты станеш шукаць дачку, калі навокал бяскрайнія лясы? Прачнуўся на досвітку і ў двор выскачыў, ды нікога не было. Так і прапала ягоная Алёна.

Але Бог злітаваўся над ёю, дапамог дзяўчыне ў цяжкую хвіліну: Не забіла яе зласліўка да смерці, толькі моцна прыглушыла. Апрытомнела дзяўчына, але ўзняцца не магла, толькі застагнала ціхенька. І тут пачула нейчы голас:

– Хто ж тэта цябе? Давай я табе дапамагу.

Болей нічога не пачула дзяўчына, бо страціла прытомнасць.

Прыйшла ў сябе ў невялічкай, чысцюткай хацінцы. За сцяною было чуваць, як стогне-галосіць вецер, хлюпоча дождж.

– Дзе гэта я?

– У мяне ў гасцях, — пачуўся зычны голас, і дзяўчына ўбачыла здаравеннага чалавека са светлай бародкай, вочы якога іскрыліся смехам.

– А ты хто?

– Я? Я – Змітрык. Жыву ў гэтай глухамані адзін. Калі быў яшчэ зусім малы, дык пошасць вымарыла ўсю нашу вёску і, злякаўшыся, збег я, куды вочы глядзелі. Неяк тут апынуўся. Далей дарогі не мог знайсці, ды, шчыра кажучы, і не шукаў. Застаўся. Так і жыву. Прызвычаіўся да лесу. Цяпер і не ўяўляю сябе без яго. А ты доўга не адыходзіла, – нечакана перавёў гаворку Змітрык. – Заставайся тут, са мной. За жонку мне будзеш.

Так і вырашыліся ўсе пытанні ў жыцці дзяўчыны. Сталі яны ў лесе жыць. Дзеці ў іх пайшлі. А калі старэйшы хлопчык падрос, то Алёна запрасілася ў мужа:

– Давай сходзім да той вёскі, адкуль я родам. Хачу глянуць, ці жывы тата, ды і людзям праўду трэба расказаць.

– Давай. З раніцы пойдзем, да вечара вернемся назад.

Так і зрабілі. Падышлі яны да знаёмай хаціны, і хлопчык зайграў на дудачцы:

– Іграю, дзедка, памалу, Каб не закрануць у мамкі рану, Бо яе сястрыца ледзь не загубіла — Цурбалкам па галаве біла... Як пачуў гранне гаспадар, дык адразу ж да іх выскачыў. Забралі яны яго з сабой жыць. Стары ўсё дапытваўся, як жа гэта яны ў лесе выжылі. На што яму Змітрык адказваў:

– Мы ляда здаровае раскарчавалі... Тады дзед толькі і паўтараў;

– Ляднікі вы мае... Ляднікі вы мае дарагія...

Так тое паселішча пасярод лесу дрымучага і назвалі потым.

## <u>Мельніца</u>

Назва вёскі паходзіць ад вадзянога млына, што знаходзіўся ў межах вёскі на рэчцы Быстрыца. Рэшткі яго захоўваліся да сярэдзіны 20 ст.

## <u>Папкі</u>

Было гэта вельмі даўно ў маёнтку пана Напоўскага (жыў пан за фермай Шчумялі, на гары). Суровы быў пан. Шмат слуг было ў пана. Жорстка распраўляўся ён з імі . Не любіў пан простага люду, асабліва маладога Янку. Аднойчы Янку ўбачыла паненка – дачка старога пана - і пакахала яго. Маладыя часта сутракаліся, а потым вырашылі пажаніцца. Даведаўся аб гэтым стары пан. Каб не зганьбіць сваго роду, ён вырашыў пакараць дачку і парабка самым суровым законам. Хлопца загадаў забіць. А на дачку сваю загадаў выкапаць яму і на вачах людзей жывую закапаць.

Прайшло многа часу, і на гэтым месцы з’явіліся вёска, якую людзі назвалі Папкі. Як памяць аб суровым пане Напоўскім і аб верным каханні.

## Прудавыя

Даўно гэта было, а калі – ніхто не помніць. Вёсачка гэта была аж да вайны, а ўжо як калгасы сталі, то яе не стала. Называлі яе Прудавое або Прудавыя (зараз тут толькі хмызняк застаўся). Некаторыя старажылы мяркуюць, што вёска названа так таму, што тут было шмат сажалак, у якіх звычайна мачылі лён і паласкалі бялізну. Пруд – значыць сажалка. Некаторыя ж мяркуюць так: пруд – вые, значыць сажалка вые. Вось якая існуе легенда.

Некалі ў нашых краях жыў злосны чараўнік, які тварыў шмат бед людзям. Людзі дагаджалі яму, як толькі маглі, абы не ўгнявіць яго, бо ўсе чараўніка баяліся. Прайшло многа часу, чараўнік састарэў, але не пакідаў займацца зладзействам, ператвараючы людзей у звяроў ці пачвар. Але аднойчы чараўнік пераблытаў старонкі чорнай кнігі (у яго дрэнная памяць і зрок) і сам ператварыўся ў ваўка. З дзікім выццём ён выбег на вуліцу, кідаючыся на людзей. Людзі думалі, што гэта воўк прыбіўся з лесу і пачалі біць яго чым папала. Уцякаючы, воўк трапіў у сажалку, адкуль больш не выбраўся.

Людзі хутка дазналіся, што знішчылі не ваўка, а злоснага свайго суседа. Але ён не пакідаў у спакоі сваіх суседзяў. Кожны раз (на сход ветаха) у поўнач ён моцна выў, палохаючы людзей і скаціну, асабліва баяліся гэтага выцця коні. Калі каму-небудзь здаралася ехаць позна ноччу ля сажалкі, то коні, пачуўшы дзікае выццё, стрыгалі вушамі, раздувалі ноздры і станавіліся на дыбы, не рухаліся з месца. Так было заўсёды, і людзям абрыдла такое жыццё. Паступова яны пакінулі гэтае месца. Так знікла гэтая вёска.

## Пялікі

Дзіўную назву  мае вёска  Пялікі. У перакладзе азначае  нізменная балоцістая мясцовасць. А , як вядома, на балотах жывуць бус лы.  Сюды іх столькі прылятае вясной, што здаецца, гэта чалавек гасціць у буслоў, а не буслы прылятаюць сюды.

А яшчэ летам па вечарам заварожваюць сваімі спевамі салаўі, іх спевы, што пералівы тальянкі, захапляюць сэрца.

Існуе паданне , што ў Пяліках жывуць самыя прыгожыя дзяўчаты. І вось з’язджаюцца сюды са ўсіх канцоў свету, каб паглядзець на ўсю прыгажосць: на буслоў, на спевы салаўёў, на прыгажосць дзяўчат, ды так захапляюцца ўсім гэтым, што пачынаюць пяліцца на гэту з’яву. Адсюль і назва такая «Пялікі» ад слова «пяліцца».

## Ручай

Вёска Ручай старажытняя. А назвалі так вёску па той прычыне, што праз вёску працякала маленькая рачулка, хутчэй падобная на ручай, па абодвух баках якога людзі і сяляліся.

*(запісана ад Пецько Раісы Міхайлаўны, в. Грыгараўшчына, 65 гадоў)*

## Радзюкі

“Хачу прапанаваць свае дзве версіі паходжання назвы вёскі.

Першая — мая, паэтызаваная. Ад бабулі чула слова «радзець» у значэнні «старацца, дбаць, быць руплівым». Казалі: «Ну, нікольк не радзее, жыве: пусці – павалюся, паднімі — устану» (пра нядбайнага гаспадара). Падумалася: Калісьці ў даўнія часы

жыў на ўзлессі чалавек.
Араў, скародзіў, сеяў жыта,
кідаў авёс у гразь,
трымаў калоды пчол,
хадзіў на звера.
Пад нівы ляды расчышчаў, ледзь днее,
Пшаніцу малаціў і апрацоўваў лён.
Казалі людзі: «Ён стараецца, радзее»,
Бо бачны быў ад дбайнай працы плён.
Ад ранку шчыраваў ён на сялібе,
Не шкадаваў ні ног, ні вузлаватых рук.
Не бачыў у ім, здаецца, ніхто хібаў.
І далі яму прозвішча Радзюк.
Ён будаваў жытло, цяпер ужо з сынамі,
З дубовага бярвення на вякі.
Іх людзі называлі Радзюкамі,
А вёску, што ўзнікла, — Радзюкі.

Можа, і мае дачыненне той руплівы і дбайны Радзюк да маёнтка Радзюкі на ўзбярэжжы Бярозаўкі, які ў 1825 годзе купіў у графоў Берастоўскіх прадстаўнік і пачынальнік знакамітага шляхецкага роду Бароўскіх, уладальнікаў герба «Ястрабец», Антон Бароўскі... Прадаўжальнікі роду Бароўскіх цяпер жывуць у Польшчы і маюць сваю версію паоджання назвы Радзюкі. Хутчэй за ўсё, гэта легенда. Прадстаўніца іх роду пані Дзюка (ад жаночага імя Ядзюнька), чароўная і прывабная, ператварыла радзіннае гняздо ў сапраўдны райскі куток: аранжарэі, экзатычныя расліны, цудоўны сад, алеі з бэзу, язміну.

Птушыны спеў у паркавых прысадах,
Альтанкі сярод бэзу і язміну.
У маёнтак запрашэнню былі рады,
І доўга ўсіх не пакідалі успаміны.
Прыемнай, дабрадзейнай была пані.
З маёнткаў Лонка, Мосары і Букі
Бароўскіх вотчына найпрыгажэйшаю прызнана.
З ахвотай госці ехалі ў рай Дзюкі.”

( *запісана ад Ардынскай Людмілы, в. Радзюкі, 70 гадоў*)



*На фота адміністрацыйны будынак КУВСП імя Маркава (былы маёнтак паноў Бароўскіх)*

**ТЛУМАЧЭННЕ ЭКСПЕРТА:**

Паселішча Радзюкі адносіцца да ліку старажытных беларускіх населеных пунктаў. Назва вёскі з'яўляецца родавым найменнем і ў мінулым абазначала зямельны надзел і месца, дзе пасяліліся прадстаўнікі аднаго роду, пачынальнікам якога быў чалавек з іменем або прозвішчам Радзюк. Тое, што гэта родавая назва, пацвярджае і факт супадзення прозвішчаў жыхароў вёскі і яе назвы. Дарэчы, на тэрыторыі Беларусі налічваецца вялікая колькасць паселішчаў, назвы якіх супадаюць з прозвішчамі жыхароў. Такая з'ява шырока адзначалася і ў старажытных пісьмовых крыніцах, якія захавалі матэрыялы перапісу людзей з указаннем назвы вёскі, адкуль яны паходзяць. Так, у гісторыка-юрыдычных матэрыялах Віцебшчыны і Полаччыны 2-й паловы XVII стагоддзя даволі часта сустракаюцца тапонімы, у якіх форма множнага ліку абазначае назву калектыву па родавай мянушцы заснавальніка роду або першапасяленца.

Найменне Радзюкі паходзіць ад асабовага імя Радзюк, якое ўяўляе сабой гутарковую беларускую форму царкоўнага праваслаўнага імя Радзівон. Гэтая форма імені была надзвычай папулярная сярод беларусаў. Пацвярджэннем таму служыць папулярнасць прозвішча Радзюк і яго аднакаранёвых варыянтаў на тэрыторыі сучаснай Беларусі. Прозвішчы Радзько, Радзькоў, Радзькін, Радзьковіч, Радзькоўскі, Радзюкевіч, Радзюль, Радзюн, Радзюш, Радзянка, Радкавец, Радкевіч, Радковіч, Радкоў, Радкоўскі адзначаюцца ў большасці раёнаў нашай краіны. Тапонімы з асновай Радзюк, Радзько сустракаюцца на Віцебшчыне (Шаркаўшчынскі, Бешанковіцкі, Полацкі, Лепельскі раёны), Гродзеншчыне (Навагрудскі, Воранаўскі, Астравецкі, Мастоўскі, Гродзенскі раёны), Міншчыне (Мядзельскі, Валожынскі, Салігорскі раёны), Брэстчыне (Камянецкі раён), Магілёўшчыне (Быхаўскі раён), Гомельшчыне (Хойніцкі, Петрыкаўскі, Акцябрскі раёны).

Акрамя навуковай думкі, мае поўнае права на існаванне ваша паэтычная версія паходжання назвы. Такія тлумачэнні звычайна з'яўляюцца ў людзей, улюбёных у свой край, у тых, хто імкнецца апаэтызаваць гісторыю родных мясцін. Слова *радет* адносіцца да ліку старажытных славянскіх слоў. Яно сустракалася (у форме *радити)* у агульнаўсходнеславянскай мове (XI стагоддзе) у значэнні «клапаціца». У гэтым жа значэнні дзеяслоў *радетн* быў вядомы і ў старабеларускай мове ў XIV — XVIII стагоддзях. Па-свойму займальная легенда прадстаўнікоў роду Бароўскіх. Гэтая легенда, хоць і не мае пад сабой навуковых падстаў, але цікавая як факт народнай творчасці і можа выкарыстоўвацца на занятках у школе або ў краязнаўчай рабоце.

## Слабада

Назва вёскі паходзіць ад аднайменнага слова, якое азначае тып пасялення, які карыстаецца часовым вызваленнем ад платы падаткаў і іншых павіннасцей. Яе гаспадары, адзіныя ў ваколіцы, што аддалі сваю зямлю пад будаўніцтва школы. Гэта школа была ўрачыста адкрыта ў 1937 годзе. Па словах Андрэйчыка М.А., гэта было вельмі ўрачаста. Сабраўся народ з усяе акругі, панаехала шмат паноў, адзін нейкі вельмі важны нават прыехаў на аўтамабілі, што ў той час было вялікай рэдкасцю. Сам Андрэйчык тады як раз пайшоў у першы клас. І ўсяго адзін год адвучыўся ў польскай школе. Успамінаў, што былі два настаўнікі з Польшы – Франак і Зося.

Вёска зжыла сябе ў 90-я гады. Зараз ад яе засталіся толькі сады, хаця да вайны ў ёй налічвалася 16 гаспадароў.

## Сталіца

У даўнія часы людзі жылі хутарамі, але паступова пачалі сяліцца разам. Месца для вёскі выбралі роўнае, як стол, адтуль і пайшла назва вёскі – Сталіца.

Па другой версіі слова сталіца азначае “століц”. Гэта азначае, што даўней, калі ў вёсках пачалі адкрывацца школы, у адной з хат для навучання сабралася шмат людзей. Можа па – гэтаму і сталі зваць вёску Сталіца, бо сабралася ў ёй ледзь не “сто ліц”.

Кажуць і так… што ў тыя далёкія часы, пасля рэформы (1861), местачковы святар надавуміў мужыкоў ісці да цара з пытаннем аб зямлі. Нашы сяляне наведалі стольны горад Расійскай імперыі і вынік быў станоўчы. Сяляне выйгралі справу з панам, ім удалося адсудзіць свае надзелы зямлі, а затое што пераадолелі такі шлях – сталі зваць іх “хадакамі”. Можа і вёска Сталіца стала звацца так з таго часу, а прозвішча Хаданёнкі мелі большасць з яе жыхароў не толькі тады, але і зараз яно часта сустракаецца.

## Станіславова

Жыў-быў Station Станіслаў. Была ў яго свая сядзіба, мелася вялікая гаспадарка. У адрозненні ад сваіх суседзяў быў Станіслаў вельмі чулы і добры, нікому, нават простаму чалавеку, у дапамозе не адкажа. За гэта яго і любілі, паважалі, а таксама спачувалі яго гору, бо ўсе ведалі сумную гісторыю пана…

У Станіслава быў брат Уладзімір, якога Станіслаў ласкава называў Вова. Аднойчы пайшлі браты на паляванне і паспрачаліся, хто больш заб’е дзічыны. Кожны пайшоў у свой бок. І калі прыйшоў час зноў сустрэцца братам са здабычай, то Вовы нідзе не было. Не вярнуўся ён і назаўтра…

З таго часу прайшло шмат часу, але Station Станіслаў хадзіў сумны. Каб хоць трохі яго развесяліць, суседзі прыдумалі спаборніцтвы, хто самы хуткі і лоўкі. Сабралася шмат паноў і адзін просты чалавек. І атрымалася так, што перамогу, амаль ва ўсіх спаборніцтвах, атрымаў гэты селянін. І калі дайшла чарга да ўручэння падарунка гаспадаром свята, то Станіславу здалося, што недзе ён бачыў гэтага чалавека. Трэба адзначыць, што па твару селяніна праходзіў вялізны рубец. Цікаўнасць узяла верх у Станіслава. Ён пачаў распытваць пра лёс гэтага селяніна. Праз нейкі час даведаўся, што просты чалавек не ведае свайго сапраўднага імя, ні адкуль ён родам, бо аднойчы на паляванні ён трапіў у лапы да мядведдзя і выратавалі яго незнаёмыя сяляне.

Пачуўшы гэту гісторыю, Станіслаў зразумеў, што перад ім яго брат Вова. Іх радасці не было канца.

З таго часу ніколі не разлучаліся браты, жылі разам , і таму іх сядзібу, а цяпер ужо вёску, пачалі называць СтаніслаВова.

## Сямёнавічы

Назва ўтварылася ад імя Сямён. У вёсцы да вайны працавала школа, пабудаваная яшчэ пры цару. У час Вялікай Айчыннай вайны двухпавярховы будынак школы быў разбураны.

## Шаркаўшчына

Калісьці вельмі даўно жыў-быў у нашай мясцовасці спрактыкаваны гаспадар. Такі ўжо быў чалавек, што і хвіліны спакойна не мог пасядзець, увесь час нешта рабіў. Людзі ўжо і пасмейваліся з яго:

– Што ж гэта ты, Ахрэм? Няхай бы хоць гадзіну якую перадыхнуў.

– А я як на цяжкай працы стамлюся, дык лягчэйшую пачынаю рабіць.

– І ў каго ты такі працавіты і кемлівы ўдаўся?

– У дзеда.

– А чаму не ў бацьку?

– Не, у дзеда, бо менавіта мяне ён ўзгадаваў. Ён мяне ўсяму навучыў, дарогу ў жыццё даваў.

– Пазайздросціш табе… Такіх людзей не знойдзеш.

– Эх, браточкі, ды і вы такія ж , толькі сябе збоку не бачыце…

– І дзеці ў цябе , Ахрэм, ненатольныя. Колькі памятаем, столькі яны табе дапамагалі.

– Гэта чыстая праўда, я іх прывучыў працаваць з калыскі. Не перагружаў работай, а даваў такую, якую маглі выканаць. Мала-памалу і мае сыночкі сталі мне вернай падмогай.

– Што падмога, то падмога. Колькі не шукай, а такіх хлопцаў ці знойдзеш.

– Ды і вашы дзеці не горшыя.

– Нашы таксама слухаюцца і дапамагаюць, але твае намнога болей. А косяць як… Паглядзець толькі і застаецца, як яны адзін за адным ідуць, а ты наперадзе.

– Не, апошнім часам сам першы не іду. Сыны мяне ашчаджаюць і пакідаюць ззаду. Першым Сцяпан валіць, за ім Іван, за Іванам Фёдарка, мой малодшанькі, Шарачок. А я ўжо за ім…

– А чаму Шарачок?

– Гэта мы яго так паміж сабой завём. Вочы ў яго не чорныя, не блакітныя, а шэрыя. Таму і Шарачок.

Адным словам, зайздросцілі Ахрэму вяскоўцы, што сыны ў яго працавітыя, што сам ён няўломак, і за гэтым усім забываліся, што і жонка ягоная – Адэля – адыгрывала ва ўсім гэтым не апошнюю ролю.

Хлопцы падрасталі, а бацькі непрыкметна старэлі. Яны нават здзівіліся, калі заўважылі, што бацька іхні ўжо сівы.

– Тата, а чаго гэта ?- нібы малыя, задалі пытанне.

– А гэта, сыночкі, гады свае сляды пакідаюць.

– Яны ўсіх так серабраць?

– Так, перад імі ніхто не ўтрымае. Якім бы асілкам хто не быў, якім бы храбрым ці трывалым, але перад імі не ўстаіць. Яны заўсёды сваё возьмуць. Спачатку не так, а потым накінуцца, прыгнуць галаву ніжэй, горб на спіне з'явіцца, ногі-рукі трымцець стануць, Потым і смерць запануе…

– Што ты , тата, кінь пра такое і думаць.

– Пажэніцеся, свае сем'і пазаводзіце, потым і пастарэеце, а вашы дзеці на змену прыйдуць. Так спакон вякоў цягнецца. Нічога людзі не могуць зрабіць, бо гэта не ў іхняй уладзе. Усё ад Бога, дзеці, на зямлі і на ўсіх нас ягоныя законы размяркоўваюцца.

Не часта пра такое гаварыў Ахрэм з сынамі, але цяпер ужо тыя болей ўвагі ўлзялялі бацькам, а працаваць дык увогуле амаль нікуды не бралі.

– Сядзіце дома, па гаспадарцы калупайцеся, а ў полі мы ўсё самі паробім. Няма чаго вам туды сунуцца. Такія ўжо з вас памочнікі…

Ахрэм спачатку крыўдаваў, але Адэля супакоіла яго. Болей таго, яшчэ і слушную параду дала:

– Зямлю ўсю, чалавеча, трэба зараней падзяліць, каб пасля нашай смерці яны не надумаліся за чубы хапацца, ды людзі каб з іх не смяяліся.

– Нашы не такія.

– Хто яго ведае, што можа здарыцца. На людзей, кажуць, часінамі находзіць, таму не трэба цягнуць. Давай, Ахрэмка, збяром сыноў вечарам ды падзелім усё пароўну, пакуль мы жывыя і пры памяці.

На тым і парашылі. Селі на прызбе і сталі чакаць хлопцаў з поля.

Павячэралі ўсе разам, і бацька адразу ж распачаў гамонку:

– Ведаю, сыночкі, што натаміліся вы моцна, што не да гэтага вам зараз, але мы з матуляй параіліся і рашылі лепей усё зараней зрабіць, каб потым позна не было.

– Не разумеем, - пераглянуліся сыны.

– А вы паслухайце, не перабівайце. Хочам мы зараз увесь наш пажытак на вас траіх падзяліць. Таксама і зямлю падзелім, каб потым у вас ніякіх спрэчак-боек не ўзнікла.

– Ды мы …

– Не спяшайцеся перабіваць. Вы выдатна ведаеце, што наша зямля, сенакос, ды палоска лесу цягнецца, нібы пуга якая, на тры вярсты ў даўжыню і на сорак сажняў у шырыню. Таму цяжка дзяліць яе, але…

– Нейк пераб'ёмся.

– Але думаю, сыночкі,- працягваў бацька, - што не пакрыўджу вас.

Сыны маўчалі, прыціхлі і бацькі.  Потым гаспадар запытаўся:

– Чаго замаркоціўся, Шарачок?

– Хачу вам выйсце падказаць, але баюся, што пакрыўдзіцеся.

– Гавары, сынку, ніхто тут крыўдзіцца на цябе не будзе. Мы ж сабраліся, каб параіцца.

– Тут, тата, такая справа. Давайце, калі вы ўжо дзяліць задумалі, то  не рэжце ўсё на кавалкі, а падзяліце ўздоўж. Як яно ёсць, так і дзяліце.

– Але ж вузенька, сынку, атрымаецца.

– Так, - пагадзіліся і астатнія, - павярнуцца канём не будзе як…

– Затое без крыўды, без нянавісці. Лічу, што толькі так  можна падзяліць. І марокі ніякай, і сварыцца мы не будзем.

– Шарачок праўду кажа, па яго, тата, і дзялі. Нам жа зямля дастанецца, не каму-небудзь іншаму.

Так і падзяліў Ахрэм усю сваю зямлю, сенажаць ды лес, уздоўжкі. Атрымалася кожнаму недзе ўсяго па дзесятку сажняў, затое ў даўжыню – на чатыры вярсты, ажно стомішся, пакуль да канца дойдзеш. Браты яшчэ і жэрабя пацягнулі, каму які надзел, і Шарачок апынуўся паміж братамі.

– Мы за табой прыглядаць будзем, - пажартаваў старэйшы брат.

– Каб не хітраваў, - дадаў сярэдні.

– Жывіце, дзеткі, дружна, - папрасіла матуля. Нам ужо мала засталося, то вы не паганьце наша імя, спраўна зямлю апрацоўвайце, каб людзі на вас ніколі пальцамі не паказвалі і не смяяліся.

Прайшло колькі часу. Памёр Ахрэм, пахавалі сыны і сваю матулю. Самі ўжо сем’ямі абзавяліся, дзеці ў іх пайшлі. Зямлі, здавалася, і дастаткова ад бацькі перапала, але, калі на тыя раты раскінуць, то ледзьве канцы з канцамі зводзілі. Ды не разгубіліся. Працавалі дзе толькі маглі, падпрацоўвалі. Рыбу хадзілі лавіць, звяроў біць. І з мясам былі, і з пер’ем. Жанкі іхнія ды дзеці ў лес па грыбы-ягады бегалі. Так і ішла справа. Былі, як кажуць, радасці, але і былі ліхія часіны. Такое яно жыццё, каб людзі ніколі  не расслабляліся, памяталі пра тое, што нехта ўладарыць над  іхнімі лёсамі.

Шарачку пашанцавала крыху болей за братоў, бо ў  яго, прама на палетку, забруілася крыніца. І вось як гэта здарылася.

Неяк узяў ён свайго старэйшага сыночка на ніву, каб  той яму хоць коніка павадзіў. Нічога, што слабы памочнік, але ж намнога весялей, чым самому, унурыўшыся, шчыраваць. Хадзіў-хадзіў хлапчук і, ведама ж, стаміўся і стаў прасіцца адпачыць.

Спачатку неяк угаварыў бацьца Яначку паводзіць яшчэ крыху, але потым Шарачок заўважыў, што і сапраўды хлапчук ледзьве ногі перастаўляе, і ў яго ажно сэрца зайшлося. Пашкадаваў малога:

– Ідзі, сынку, вунь пад той кусцік, што наперадзе, і там пасядзі, адпачні. Я яшчэ пару кругоў прайду і да цябе далучуся. Палуднаваць будзем.

Яначка пакіраваў да таго кусціка, прысеў і пачаў корпацца ў пясочку. Ведама ж – дзіця. Бацька хадзіў за сахой, а хлопчык іграўся і раптам закрычаў:

– Татка! Татачка!

Ужо бацька зусім блізка. Падляцеў, слова сказаць не можа, так пералякаўся ды засопся, толькі прыціскаў сына да сябе.

– Што тут, Яначка? Што, сынку? Я з табой…

– Глядзі, што я там знайшоў..

– Дзе?

– Пад самым кусцікам…

Гаспадар упёрся поглядам пад кусцік, але нічога там не заўважыў.

– Ты лепей паглядзі, - сказаў Яначка, выкруціўся ад бацькі і падскочыў да кусціка.- Глядзі…

Шарачок заміргаў вачыма.

– Вада? Адкуль яна тут?

– А яна, татка, з зямлі выбівае..

– З зямлі? Сыночак, Яначка, дык гэта ж крынічка! Вада студзёная заўжды цяпер пад рукой будзе. Не трэба з дому браць і потым цёплую піць.

Бацька з сынам выбралі вольны час, прыехалі спецыяльна да крынічкі, расчысцілі яе дно, паглыбілі яго, а вакол узвялі дубовы зруб. Павесілі на кусце конаўку, каб было чым піць ваду, адтуль усё і павялося.

Працуюць, працуюць сяляне ці сялянкі, а потым нехта разагнецца і прамовіць:

– Пайшлі да Шаракоўшчыны. Там вадзіцы пап'ём..

Так тая крынічка і служыла людзям. Доўгія гады, нават, стагоддзі гэта ўсё працягвалася. Ніколі да яе не зарастала сцяжынка.

Дзякуючы таму, што некаль маленькі Яначак пакорпаўся ў пясочку і дапамог вадзе выбіцца выбіцца наверх, бруілася тут чысцюкая крыніца. Поле тое людзі называлі па-рознаму, хто Шаракоўшчына, хто Шаркаўшчынай. Так і вялося. Тамц і ў нашы дні можна пачуць усялякія назвы, але лепей за ўсё гучыць Шаркаўшчына, хоць мясцовыя жыхары прамаўляюць і Шаркоўшчына.



# Шышкі

Жыла ў гэтых мясцінах бедная і нешчаслівая сям’я. Прозвішча іх было даволі смешнае: Шыкша. Ва ўсім і заўсёды ім не шанцавала. А калі нарадзілася першае дзіця, то гора яшчэ і прыбавілася. Памерла маці з родаў, а бацька не ведаў, што рабіць з такім маленькім. Каровы ў іх не было, а толькі кабылка з жарабём. Прыйшла да іх бабка-павітуха ды й кажа: “Даі кабылку ды кармі малога, не паміраць жа яму з голаду”. Бацька так і зрабіў. Падрастае хлапчук, а гора за ім крадзецца. Памёр і бацька. Застаўся хлапчук зусім адзін. Галадна і холадна ў хаце, а хто там беднага сіротку любіць? Падрос хлопчык, і было ў ім нешта незвычайнае, а хітрасці хоць адбаўляй. Бывала, выскачыць з хаты, стукне нага аб нагу, заржэ, як конь, ды памчыцца так, што толькі вецер засвішча ў вушах, і ніхто яго дагнаць не мог. Дзівяцца людзі: “Гляньце, Шыкша панёсся, як шалёны”. Прайшоў нейкі час. Ніхто яго ўжо не мог нават на кані дагнаць. За свае хуткія ногі не раз меў Шыкша грошы (біўся ў заклад, што яго не перагоняць, і заўсёды так было).

Прыехаў аднойчы ў маёнтак малады паніч. Расказалі яму вяскоўцы пра незвычайнага хлапца. Захацелася яму пазабавіцца ды з беднага сіраты пасмяяцца.

Паклікаў ён да сябе Шыкшу ды кажа:

– Чуў я, што ты бегаць вялікі мастак і ахвотнік. Хацеў бы я з табою навыперадкі праехацца.

– Чаму ж не.- згаджаецца Шыкша. – Праедземся ці прабяжымся?

– Ты пяшком, а я – вяршком.- кажа пан.

– Добра,- згаджаецца Шыкша. – Ну, а хто пераможа, што за гэта будзе мець? – пытаецца сірацінка.

– У мяне то багацця хопіць, каб цябе ўзнагародзіць, а вот што з цябе, абарванца, возмеш?

– А мне багацця твайго не трэба.

– А што ж табе трэба?- пытаецца пан.

– Яловых і сасновых шышак на дровы, колькі я захачу.

– Дурны дурное і хоча,- зарадаваўся скупы пан.- Гэтага дабра хай бярэ колькі захоча, не шкада.

Пастаялі яны крыху ды і кінуліся навыперадкі – хлапчук бяжком, а пан вяршком. Не паспеў пан і азірнуцца, як хлапец дабег да ўмоўленнага месца і чакае яго. Здзівіўся пан і кажа:

– Несправядліва гэта, давай яшчэ раз прабяжымся.

– Добра,- кажа хлапчына,- давай яшчэ раз.

Зноў, як вецер, пранёсся Шыкша, далёка кінуўшы пана.

Раззлаваўся, разгневаўся пан і зноў з маёнтка кудысьці з’ехаў. Ад’язджаючы, злосна буркнуў эканому: “Дай Шыкшу шышкі на дровы”. Эканом падумаў, што са злосці пан сказаў не тое, то і даў Шыкшу лесу. Так і збудаваў сабе хлапец хацінку. З таго часу яму заўсёды шанцавала, хутка ён разбагацеў, а суседзі сталі казаць пра яго: “Глянь ты, што робіцца. Быў ты Шыкша, а цяпер Шышка (значыць, важны)”. Ды і толькі паступова іншыя людзі сталі побач будавацца. Так і з’явілася вёска Шышкі. А сваю фанабэрыстасць шышкаўцы захавалі і да нашага часу.

# Юзіха

Гэтая гісторыя надта даўняя. Здарылася яна, калі яшчэ, можа, прыгон быў у самай сіле. Людзі тады амаль ніякіх правоў не мелі. Што памешчык загадваў, тое і выконвалі. Болей таго, пан мог прадаць сваіх людзей, разлучыць іх назаўсёды, маладога хлопца, які нечым яму не дагадзіў, аддаць у салдаты.

Такая гісторыя і ў нас здарылася. Быў у адной матулі сын. Звалі яго Юзік. Бацьку яго некалі сасна ў лесе прыдавіла, таму хлопец за дваіх цягнуў гаспадарку. Зай-здросцілі людзі, што яны шматлікімі сем'ямі не маглі так упраўляцца, як Юзік адзін, хвалілі яго.

Маці ажно цвіла ад гордасці. Яшчэ б! Каму не спадабаецца, калі ягонае дзіця хваляць?

– Сыночак, адпачні крыху, да равеснікаў схадзі, пагуляй. Якую дзяўчыну дамоў правядзі...

– Рана мне яшчэ, матуля, – аджартоўваўся той. Нічога не рана. Якраз твая часіна гуляць прыспела.

Сама падганяла хлапчыну, а потым будзе яго за гэта і праклёнамі чорнымі частаваць. Але ж яна не ведала, што сын пакахае не тую дзяўчыну, якая ёй самой падабалася.

Аднаго разу, калі маці ў чарговы раз прыстала да яго ўсё з тым жа пытаннем адносна жаніцьбы, Юзік не выт-рымаў:

– Ды ёсць у мяне дзяўчына. Я кахаю яе і хачу прасіць, каб ты дазволіла мне да яе сватоў паслаць.

– Вось як... А хто ж яна такая?

– Алёнка.

– Алёнка? Гэтая галадранка?

– Навошта ты так, мама...

– Не, на ёй ніколі жаніцца не дазволю. Хіба што праз мяне пераступіце!

– Чаму, мама?

– Не пара яна табе!

– Але ж я яе кахаю.

– Знойдзеш сабе іншае каханне!

– Ды не хачу я іншай.

– То і з гэтай ты ў мяне шчасця не пабачыш.

– Навошта ты так гаворыш, я ж твой адзіны сын?

– Не сын ты мне болей, калі не жадаеш мяне слухацца! Так і ведай!

Але хлапчына не паслухаўся і ажаніўся. Людзі ўхвалялі такі ўчынак, што, маўляў, у чалавека свая галава на пля-чах і ён сам мяркуе, як яму далей жыць. Толькі ж жанчына не паддалася — пайшла да пана і папрасіла, каб аддаў Юзіка ў салдаты.

– Вось дурная жанчына, — вырачыў той вочы, — іншыя плачуць-галосяць, каб не аддаваў, а гэтая наадва-рот. Потым жа на коленцах перада мною станеш поўзаць, каб дапамог табе чым...

– Не, паночку, не буду. Толькі дзякуй скажу.

– І чым жа табе сын гэтак дапёк?

– Не слухаецца, паночку.

– Добра, няхай будзе па-твойму.

Як даведаўся Юзік, што яго аддаюць у салдаты, то горка-горка заплакаў, так не хацеў разлучацца з жонкай, а тая яшчэ болей плакала і ўсё прыгаворвала:

– Звядзе яна, Юзічак, мяне са свету белага. Не наканавана нам з табой болей пабачыцца...

– Супакойся, родненькая, нічога благога маці табе не зробіць.

– Не, сэрцам чую, што злое яна задумала.

Перад самым адыходам прасіў сын, каб маці не крыўдзіла нявестку, а чым магла навучала, дапамагала.

– Я ўжо яе навучу, – буркнула тая ў адказ.

А што далей было, то нашы людзі нават песню напісалі, і ў ёй чыстая праўда. Паслухайце.

Ой,чыё то жыта?
Чые то пакосы?
Чыя то дзяўчына
Распусціла косы?
Косы распусціла,
Гуляць не хадзіла
Гэтая дзяўчына
Хлопца прысушыла.
Мела маці сына,
Рана ажаніла,
Маладу нявестку
Адразу неўзлюбіла.
Праважала маці
Сына ў салдаты
Маладу нявестку -
Ў поле жыта жаці.

Як прыехаў сыну:
“Добры вечар,маці,
А што за таполя,
Расце каля хаты?”
“ Не пытайся, сыну,
Пра тую прычыну,
Бяры тапарыну,
Сячы тапаліну!”
Рубануў раз першы –
Яна пахіснулась,
Рубануў раз другі –
Яна запрасілась:
“Не сячы, мой мілы,
Я – твая дружына,
Разгарні ты голле,
Там- малы дзяціна!”

Расказвалі людзі, што калі Юзік пайшоў, то ягоная матуля па-ўсялякаму чаплялася да нявесткі. Людзі ўсё чулі і бачылі дык паміж сабою гаманілі:

– Зноў няшчасную Юзіху свякроў лае. Чаго ёй толькі нестае, чаго дабіваецца ад маладзіцы?

А гаспадыня дабівалася аднаго — звесці нявестку з белага свету. Тая ўжо і не спала амаль, не адпачывала ніколі, ўсе старалася дагадзіць наравістай жанчыне, але замест добрых, спагадлівых слоў заўсёды чула толькі адно:

– І за які грэх мне такое пакаранне?

– Няўжо я вам, матуля, такая кара?

– Маўчы, гадаўка, — абрывала нявестку.

Тая і не вытрывала надта доўга. Аднае раніцы знялі яе сяляне з разгалістай вярбы, якая расла над самай ра кой. Там жа, на беражочку, і пахавалі бедалагу.

Калі вярнуўся з войска Юзік, то першай справай пачаў дапытвацца, дзе жонка. Яму і паказалі зарослую магілку. Тады ён кінуўся ў раку ды ўтапіўся.

Даўно гэта было. Няма і тае вярбы, і тае рачулкі, а вось памяць пра гаротную жанчыну захавалася ў паданні. Ад гэтага падання і веска пайшла – Юзіха.

## Якубова

Названа  яна так таму, што некалі тут жыў добры чалавек, ляснік Якуб. Пазней каля сядзібы лесніка пасяліся сем'і Буртовічаў, Курыловічаў і Рачыцкіх.  Хутар з трох хат пачалі называць Якубоўкай. Жыхары хутара займаліся ў асноўным земляробствам. Па прыходу Савецкай улады, у сакавіку 1949 года, жыхары хутароў Багута, Белазоры, Буланіха, Скарбніца былі пераселены да хутара Якубоўкі. Так з'явілася вёска Якубова.



# Легенды і паданні пра рэкі і азёры



Рэкі… Яны як і людзі маюць свой лёс і свой шлях. Цякуць у прасторы і часе блакітнай стужкай звязваюць між сабой пакаленні продкаў і нашчадкаў.

Людзі заўсёды сяліліся на берагах рэк. Рака паіла іх чыстай вадой, карміла рыбай, была самым зручным шляхам зносін.

Людзі шанавалі раку, на якой жылі, любілі, як маці, маліліся ёй, складалі песні, легенды, паданні.

## Пра Дзісёнку

З той пары можа мора вады сплыло, як тое было. Яшчэ за прыгонам, мой прадзед расказваў, а я тады невялікі быў, алі вот запомнілася мне гэта ці то праўда, ці то байка.

Кажуць, пры прыгоне тут пан быў адзін. Дужа чалавек благі быў, крый ты Божа. Калі ўжо што не так, дык не знаіць прама, як пакараць чалавека. Асобінна дзіўчат маладых ды красівых не любіў. Дык казалі, што на Дзісёнцы, на самым глыбокім месцы кладка была зроблена. А на той кладцы людзей тапілі. Правініцца хто, дык атвязуць на сярэдзіну ракі, на кладку туюю паставяць, а тады плечы яму, ну іваліцца той бідняжка ў ваду.

А ў маладзіц каторых, бывала, родзіцца дзіцёнак, ну дык як спакойны, то нічога, так-сяк гаруець ды гадуецца. А ў каторых бываіць, ведаеш, такі крыклівы, што ні дай ты Бог. А пан тожа гэтага крыку дужа не любіў. Дык скажыць тады сваім слугам там ці каму: “У раку яго, паганца.” Ну а слугам што? Ці ж ты прыказ той ня выпалніш? Самаму тады што рабіць? Ну дык хватаіць там проста з-пад бабкі ці там аднекуль гэтага рабёначка і ў раку нясець.

Дык вот дзела было ў жніво. Жыла маладзіца, жала, прыстала, а аддыхаць жа ні сядзеш. Аж чуець рабёначак яе пад бабкай так крычыць, што ня вытравала, пашла, каб паглядзець яго і накарміць можа. А тут пан, як з-пад зямлі вырас. І чуець яна прыказ: “У раку паганца!” Заламала маладзіца рукі, загаласіла, у нагі да пана паваліласся, просіць, моліць, а пан як і ня чуець. Забылася, бедная, і на страх, і на пана. Пабегла за слугамі следам плачучы: “Пажалейце дзіцёначка.” Так і называюць нашу раку, і Шаркаўшчыне, дык Дзісна, а ў нас тут дык Дзісёначка.

*(Запісана ад Скіпар Разалі в. Вялікае Сяло, 1982 г.)*

У «Матэрыялах па гісторыі і геаграфіі Дзісненскага і Вілейскага ўезду Віленскай губерніі” за 1896 год гаворыцца, што Дзісна бярэ пачатак у Ковенскай губерніі з возера Дзісна. Затым яна ідзе на поўдзень цэлую вярсту балотамі, упадае у возера Дзіснішча, а з яго ужо цячэ на паўднёвы захад. На сваім шляху ўбірае ў сябе маленькія рэчкі-прытокі: Ізабелінка, Бірвіта, Полаўка, Мнюта, Янка і інш.

З дзённіка Язэпа Драздовіча: “А ўсё ж такі наша Дзісёнка – адна з найпрыгажэйшых рэк Беларусі. Якія пекныя стромавысокія берагі! Так і здаецца, плывучы па ёй, што ты плывеш не ракою, як стол роўных роўнядзяў, а ракою нейкай горнай краіны, дзе берагі месцамі, што сцены муроў”.



**Возера Княж**

Ёсць вёсцы Сталіца возера Княж. Назва гэтага возера таксама звязана з легендай.

Даўным – даўно на месцы, дзе цяпер знаходзяцца могілкі, стаяў маёнтак князя. Вакол вёскі быў вялікі густы лес. У лесе было возера, вакол якога знаходзілася балота. Высокія сосны акружалі гэта возера. Малады сын князя аднойчы паехаў да возера на паляванне. З-за сваёй неасцярожнасці ён папаў у балота і загінуў. З таго часу возера сталі зваць “Княж”.Сына князя не стала, а на месцы маёнтка з’явіліся могілкі.

# Пра Вадзянкі

У вадзе не толькі русалкі, а а і вадзянкі жывуць. Іх тожа хоць хто, а відзіў. Даўно тут жыў у нас, Болюсь, памёр, як я яшчэ маладой саўсім была. Дык яго дзед яму расказваў. У Пашках гэта было. Цяпер гэта дзярэўня есць, вялікая, а тады, казалі, невялічкая была.

Вот палюбіў маладзец дзеўку. Параскай, уродзі, звалі, а мальца дык, помню, казалі Пятрок. Параска была, дзеўка добрая, рабацяшчая такая, і красівая. Маткі ў яе не было, бацька, толькі бацька быў благі чалавек, а мачаха (Марыяй звалася) дык сцеражы ты, божачка, што за баба благая была. Есці, бывала, дзяўчыне гэтай не дасць, свайго толькі сынка любіла і песціла. Ну і гаравала гэдак бедная дзеўка. Ну а тут малец гэты, думала, што ён усур'ёз да яе, а ён толькі пасмяяўся. Абняславіў сірацінку і кінуў.

Прайшло ўжо ўрэмя парадашна. Прышоў дзеўцы той срок радзіць, а што ж ёй, беднай, рабіць, мачаха і на парог ня пусціць і бацька гэдак сама. Сабралася яна, пашла да ракі, у кустоўе забралася, мальчыка радзіла. І як не было ёй цяжка, хацела ўтапіць гэтага рабёначка. Звізала яго ў полачку, размахнулася і кінула ў рэчку. А дзела была перад самым захадам сонца. Дык вот гэты звязачак, рабёначка гэтага, відзіць Параска падхваціў на рукі ні то чалавек, ні то рыбіна, як чалавек. Ногі, як і ў чалавека, плаўнікі, як у рыбы, і цела лускай пакрыта. Самлела яна ад страху, алі глядзіць, што далей будзіць. І сама ні знаець, што рабіць. А чалавек-рыбіна валасы зялёныя, лахматыя, як ціна, ад вады аброс, плаўнікамі, як рукамі рабёначка да сябе прыціснуў і прапаў у вадзе, а дзіцятка на ўсю сілу закугакала.

Сядзіць гэта дзеўка непрытомная і ўсё слухаець, як гэта дзіцятка плачыць. Доўга нікому нічога не казала, маўчком ўсё хадзіла.

Аж праз некаторае ўрэмя з ухажорам ейным біда зрабілася. Пайшоў падвячорак купацца і ўтапіўся. Казалі, што і яго вадзянік схваціў за тое, што праз яго нявінная душка пастрадала. А на тым месцы дык і цяпер, у поўнач, часта рабёначак кугакаець, дык гэтага месца людзі баяцца.

*(Запісана ад Гапанёнак Баляслава, 82г., в. Ручай)*

# Легенды і паданні аб камянях, парках



У наш век, век асфальту і бетону, знікаюць маленькія вёскі, расліны і жывёлы. І толькі каменныя волаты яшчэ застаюцца. Яны — неад'емная частка беларускага краявіду, прыроды і гісторыі, сучаснасці і старажытнасці.

## Шалёны камень Грыдзюшкаўскі



Жыхарка вёскі Малыя Грыдзюшкі Соф’я Юльянаўна Прахаронак паведаміла многа цікавых звестак пра Шалёны камень Грыдзюшкаўскі: ”Аднаго разу бег каля камня звар’яцелы чалавек. Раптам паваліўся на яго і пачаў грызці. Так і вылечыўся”.

Па легендзе Шалёны камень Грыдзюшкаўскі вылечвае мясцовых жыхароў ад цяжкіх хвароб, прыдае фізічную сілу чалавечаму арганізму.

Пра гэты валун у сваёй працы “Дзісенская дагістарычная старына” пісаў Язэп Драздовіч.

Камень даследвалі навукоўцы з Мінска, бралі яго частку для правядзення хімічных аналізаў.

## Верчын камень

Многа было тут усякіх случаяў ў нашай дзярэўні. Вядома ж даўней, ня тое, што цяпер. Цяпер дык і людзей неяк мені ў дзіраўнях ды і дзеравень каторых саўсім ні стала. А даўна дык збяромся, бывала, ці святам, ці ўвечары ў каго ў хаце (як зімой, а як летам, дык дзе ля хаты) ну і давай ўспамінаць так сто ці болей назад.

Тут, проць Пашкоў, у Дзісёнцы вялікі-вялікі камень ляжыць. Бабы на ім адзежу палошчуць, стаяць, як на стале, алі кажуць, што ноччы (асобінна ўвосень перад памінальнымі днямі) дык адзін страх: сядзіць на тым камяні баба ці дзеўка і нагамі па вадзе шлёпаіць. Дайней, як вадзілі на начлег, дык бываюць хто ўвідзіць, дык так спужаецца, што аж да сябе дайсці ня можыць. Кажыць: “Ай, братцы, Верку відзіў. Сядзіць на сваім камяні.” Як адзін хто, дык відзіць, як многа – дык не відаць там той бабы ці дзеўкі. Дык мы, бывала, вечарамі, баімся да ракі ісці, баімся Веркі на камяні.

А дзед мой казаў, што дзела было гэта так. Была ў Гапаніхі (так у дзярэўні бабу звалі адну) дачка Вера, а ў дзярэўні ды проста Верай звалі. Дзеўка была проста, як кажуць маліна. Красавіца, косы, знаеш, за пояс, вочы чорныя, стану спрытнага. Дзеўка, як тачоная, мальцаў… адбою не было, сваты за сватамі. Хоць не дужа багатая, ну красавіца, нічога не скажаш. Ну і дагаварыліся тут з адным мальцам, што ўвосень вяселле ўжо спраўляць будуць. Рада Гапаніха, што дачка за багатага замуж пойдзець. Дык вот Бог не дай. Захварэла яе Верка на воспу, а даўней, знаеці ні дахтароў гэтых, ні лікарства якога там. Вот і хварэіць бедная дзеўка. І матка з гора чахніць, а што тут зробіш? А ліцо ўсё ў струпах, у больках у беднай гэтай Веркі. Кажуць бабы Гапаніхе: “Ні давай ніколі люстэрка гэтай Верцы, як увідзіць, што з яе ліцом, дык ні перанясець дзеўка такога гора.” Ну і старалася баба то так, то сяк дачку абмануць, каб і ні знала, што з красавіцы страхоццем зрабілася. Алі ж дзе ты схаваеш гэту праўду. Адхінулася тады некуды Гапаніха, а люстэрка забыла схаваць, ну і глянула, бідняжка, на сябе, рукі заламала, загаласіла ды да ракі. (Яны жылі ад Дзісёнкі саўсім блізка). Ускочыла, кажуць, у лодку, ад’ехалася на сярэдзіну ракі да і бухнулася. Матка, як прыйшла дамоў, дык сразу паніла, што такое: бягом да ракі, а там толькі адна лодка пустая, а сукенка, кажуць, на камяні ляжала. Мусіць палажыла, каб знали, дзе шукаць. Ну нашлі дзеўку, пахавалі, пабедавалі ды й забыліся, а матцы, знаеце, як гэта душа на часці ірвецца. Дык яна, бывала, пойдзіць, сядзіць на камень і галосіць, і прыгаварваець там усяк. Алі адзін раз, казалі, галасіла яна галасіла, а тады як закрычыць гвалт: “Ой людцы, Верка мая на камяні сядзіць”. І перастала хадзіць на гэты камень матка з таго ўрэмя, праўда ўскорасці і сама памерла. Вот і сталі казаць на гэты камень Верчын. Так вот і называюць. Праўда цяпер ён ужо слаба відаць з вады, але яшчэ відаць. Кажуць, уродзі і цяпер позна ноччу, перад памінальнымі днямі, не то смяецца, не то галосіць баба. Ну ні знаю, даўно ўжо там ні жыву і ні быў там.

# СТАРАЖЫТНЫЯ ПАРКІ

## Ганаўскі парк

Калі ехаць па дарозе на Іёды, ля вёскі Варонка за ракой, бачны парк Ганава, які фарміраваўся ў два этапы з інтэрвалам каля 100 гадоў (другая палавіна XVII і першая палова XIX стагоддзя) на плошчы больш 16 га.

Бібліятэкар Лонскай бібліятэкі Кандрацьева Наталля Віктараўна расказала мне чаму парк так называюць. А справа ў тым, што мясцовы пан залажыў парк у гонар сваёй жонкі Ганны, якая нарадзіла пану сына.

Парк выцягнуты не па восі, як звычайна, а перпендыкулярна да яе. Да цэнтральнага баскета з бакоў прымыкаюць па аднаму баскету, да параднай часткі – дзве невялікіх, прамавугольнай формы дзялянкі (80х90) з абсадкай ясеня па перыметру. Цэнтральны баскет акаймаваны ліпавай алеяй (шырыня 3 м, пасадка ў радзе 0,5 м). Маршрут для прагулкі састаўляў 1,3 км. Высата ліп у алеі 32 м, іх узрост больш 200 год. У нішы алеі знаходзілася альтанка. У баскетах раслі фруктовыя сады, якія адрозніваліся разнастайнасцю дробнаплодных яблынь. Парк меў другі (запасны) уезд у выглядзе бярозавай алеі, размешчаннай перпендыкулярна асноўнай кампазіцыйнай восі. (Апісанне паркаў сядзіб Германавічы і Гарадзец гл. у п.1 Помнікі палацава – паркавага будаўніцтва).

У нас час парк Ганава лічыцца помнікам прыроды бо ў ім прадстаўлена ўся разнастайнасць флоры нашай мясцовасці.

## Парк Сельгастэхнікі (СХТ)

У 18-19 ст. па суседству з мястэчкам Шаркаўшчына размяшчаўся маёнтак Чырвоны Двор. Зараз гэта раён вуліц Чырвонадворская, Чырвоная Горка і гарадскога парка. Да нашага часу захаваліся рэшткі велічы былога маентка: панскі дом, капліца, частка парка, пруды.

Спачатку маёнтак належыў Лапацінскім. У 1753 годзе Мікалай Тадэвуш Лапацінскі набыў маёнтак у Шаркаўшчыне. У 1770 годзе Шаркаўшчыну пераняў ад бацькі яго сын ЯН Нікодэм. Тут, у маляўнічым месцы на беразе ракі Янкі, ён абаснаваў сваю рэзідэнцыю. На працягу 1770 – 1776гг. збудаваў палац мураваны двухпавярховы, капліцу каталіцкую, заклаў парк, сажалкі, аранжарэю, цяпліцу і звярынец.

Потым Чырвоным Дваром на працягу амаль 200 год валодаў род паноў Багуцкіх. Росквіт маёнтка прыйшоўся на пачатак 20 ст. Двухпавярховы белы будынак панскага дому на ўзвышшы, упрыгожаны балконамі і каланадай, аранжэрэя, галерэя з карцінамі знакамітых мастакоў таго часу, звярынец – вось толькі няпоўны спіс.

Палац з 1939 года стаў уласнасцю дзяржавы, выкарыстоўваўся як клуб. Пасля другой сусветнай вайны – кантора МТС, а з 1953 года перабудаваны ў жылы шасцікватэрны дом.

Да нашага часу захаваліся рэшткі панскага парку і ўсе пяць сажалак. Парк складаўся з ліпавых алей, якія звязвалі паміж сабой сажалкі і насыпныя штучныя ўзгоркі. Нягледзячы на частковую захаванасць, парк яшчэ ўражвае сваімі памерамі.

Насупраць дома (прыкладна за 150 метраў) была пабудавана капліца. Ад панскай сядзібы да капліцы ішоў падземны ход, сцены якога былі выкладзены чырвонай цэглай. На жаль, пад час будаунічых работ у 90-х гадах падзямелле было разбурана.

Жыхар Шаркаўшчыны Выжыкоўскі С.Т. расказаў паданне, звязанае з капліцай. Яно сведчыць аб тым, што сын Багуцкага закахаўся ў бедную дзяўчыну, але бацькі не дазволілі ім ажаніцца. Дзяўчына атруцілася ў капліцы. Малады хлопец, даведаўшыся пра гэта, застрэліўся. Пахаваны яны побач з капліцай па прыказу ксяндза, насуперак волі бацькоў. Каля капліцы размяшчаліся невялікія радавыя могілкі паноў

Багуцкіх, з жалезнымі надмагільнымі плітамі.

Зараз слядоў былых упрыгожванняў няма. Фундамент захаваўся часткова, моцна прасеўшы ў зямлю. Унутры будынка вільгаць, хоць ён і выкарыстоўваецца як жылы дом.

# *Павер'і і перасцярогі нашых продкаў*



Мы лічым сябе сучаснымі людзьмі і нават не падазраём наколькі моцнай застаецца наша сувязь з продкамі: пакінутыя нам дзядамі у спадчыну “забабоны”, як называюць матэрыялісты пэўныя стэрэатыпы мыслення народа, прайшлі пэўную “шліфоўку” і вельмі гарманічна ўпісаліся ў наша сучаснае жыццё. Яшчэ ў 1895 г. вядомы этнограф А.Я. Багдановіч у сваім нарысе пісаў: “...Беларусы прытрымліваюцца вельмі многіх забабонаў зусім падсвядома, не робячы ім ніякага тлумачэння. І калі вы спытаеце: чаму гэта можна рабіць, а вось гэтага нельга, то ў большасці выпадкаў вам адкажуць: хто яго ведае; такая ад старых людзей пагалоска ідзе; старыя людзі ведалі, таму што разумней за нас былі; так айцы і дзяды рабілі і нам загадвалі...” Здаецца, што і праз 200 гадоў мала што змянілася ў свядомаеці нашых суайчыннікаў. Вось толькі магі XXI стагоддзя “забабоны” называюць ужо магіяй прыкмет...

“Нельга есці, калі ў печы адчынена заслонка - будуць людзі абгаварываць,

Да году малому дзіцяці нельга даваць рыбу - не будзе доўга гаварыць.

Калі купаем дзіця першы раз, то спачатку трэба ліць халодную ваду, а затым гарачую, каб не быў “гарачым”, “таропкім”.

Каб у хаце вадзіліся грошы, трэба венік трымаць уверх мятлой.

Валасы трэба падстрыгаць на малады месяц, каб хутчэй раслі.

На вяселлІ паміж маладымі не павінна быць ножка стала - да хуткага разрыва.

Да года ў дзіцяці нельга абстрыгаць валасы – будзе тугадумам, павольна развівацца ў разумовых адносінах.”

*Алена Уладзіславаўна Міранові в. Лужкі*

“Ні ў якім выпадку не называць адным імем трох чалавек з адной сям’і: напрыклад, бабуля Ганна, яе дачка Ганна і ўнучка Ганна. Пасля смерці першай можа хутка не стаць трэцяй.

Нельга даваць навароджанаму імя загінуўшага чалавека.

Ніколі не вешайце сушыць за падол (толькі за плечыкі) дзіцячыя распашонкі - паклічыце бяду ці хваробу.

Нельга есці перад люстэркам - “з’ясі сваю прыгажосць”.

Нельга аддаваць ці прадаваць дзіцячыя рэчы да году – могуць сурочыць.

Каб хутка бегаць, трэба ў карман пакласці асот.

Калі дзіця памрэ да году, то трэба хаваць яго ў тым адзенні, у якім хрысцілі.

Каб вяліся грошы, ногці трэба абстрыгаць у аўторак ці пятніцу.

Нельга на працягу года будаваць новую хату, класці новую печ, рабіць нават бягучы рамонт, ладзіць святочныя гулянні, калі ў сям’і памёр нехта з родных.

*Надзея Ільінічна Андзілеўка в. Лужкі 2002 г.*

Калі апранаючыся зашпіліўся не на той гузік, то трэба разшпіліцца і зрабіць гэта нанава.

Калі падмятаеш падлогу, то нельга прарывацца да другой работы - муж будзе біць.

Кал стаўчэш кашу, то нельга аблізываць качалку (таўкушку) - муж будзе лысым.

Перад крышчэннем дзіцяці хросным бацькам забаронена хадзіць у туалет - малое будзе вельмі часта мачыцца.

Нельга на вяселле на стол засцілаць абрус левым бокам - толькі на памінках, ці жалобных сталах.

Калі замуж выходзіць малодшая сястра, а старэйшая застаецца дома, то маладой неабходна выходзячы з-за стала да вянца крышачку пацягнуць за край абруса.

Маладым забараняецца хадзіць па пахавальных кветках каля царквы.

Першым хрэснікам у незамужняй дзяўчыны павінен быць хлопчык, а ў юнака - дзяўчынка, аднак хтосьці ў некага забярэ шчасце.

Члены сям’і памершага не маюць права кідаць у магілу 3 жмені зямлI, ім забараняецца садзіцца за першы жалобна- памінальны стол.

Калі пад час хрышчэння дзіця плачыць - гэта значыць, што з яго выходзяць злыя духі, а калі сціснуў кулачкі - будзе скупым.

*Ірына Рыгораўна Крыўко в. Іванава, 2002 г.*

Нельга адказваць цяжарнай жанчыне - нападуць мышы.

Ёй таксама нельга есці ў потай - дзіця народзіцца злодзеем або будзе красці.

Выццё сабакі прадказвае або выклікае смерць ці няшчасце, таму каб сабака перастаў выць, трэба ў хаце штосьці з посуду перавярнуць уверх дном.

Нядобрым знакам лічыцца крык пугача ці крумкача над хатай.

Нельга утыкаць нож у хлеб – пазнаеш голад.

Калі па вёсцы лётае зязюля - да пажару.

Ідучы куды на справу лепш каб сустрэўся мужчына.

Каб каровы ішлі з пашы дадому, трэба хлеб даць панюхаць чужой карове, а аддаць з’есці сваёй.

Каб новая карова ішла з поля дадому, трэба першы раз як яна выйдзе з хлева, зямлю з-пад задніх капытоў кінуць назад у хлеў.

Нельга пакідаць рукавіцы (пальчаткі), шапкі і касынкі на стале - будзеш у даўгу.

Пустую бутылку нельга пакідаць стаяць на стале - не будзе грошаў.

*Сафія Ільінічна Хахлун в. Васілева, 2002 г.*

Калі курыца запяе пеўнем - будзе пажар або няшчасце. Яе трэба хуценька засекчы.

Добра, калі бусел саўе ў каго-небудзь на хаце гняздо - значыць гэты чалавек будзе шчаслівы і багаты, але калі бусел наадварот разбурае сваё гняздо, то гаспадарам той хаты ён прадказвае бяду.

Калі цяжарная жанчына ўбачыць дзе-нібудзь пажар або чаго спалохаецца, то ёй нельга хватацца за сваё цела - дзіця народзіцца з чырвонымІ плямамі.

Калі цяжарнай жанчыне прыходзіцца ісці ў хаўтуры, то вакол сябе трэба абвязаць чырвоную нітку, каб дзіця не было бледным.

*Вера Паўлаўна Клімковіч в. Лужкі, 2002 г.*

Калі парвецца карман - чакай згубы, фінансавай страты, непрыемнасцей.

Калі штосьці згубіш, то не трэба перажываць, сумаваць, значыць абавязкова штосьці знойдзеш. І наадварот, калі знойдзеш - не выхваляйся, бо тое ж і згубіш.

Калі купляеш якую-небудзь рэч, то не аддавай усе грошы так, каб кашалёк аказаўся пустым — да канца жыцця ў карманах будзе пуста.

Нельга дарыць закаханаму насоўку - растанешся назаўсёды.

Смецце ў хаце трэба мясці ад парога і выносіць у саўку, бо вымецеш поспех са сваёй сям'і.

Нельга махаць рукой сябру, які адходзіць - бяду навядзеш на яго.

Каб карову не сурочылі, трэба яе падаіць, малаком абмыць капыты І малаком зрабіць крыж на спіне.

*Ніна Аляксееўна Бурбель в. Дзіўнае, 2002 г.*

Нельга мыць бялізну ў панядзелак - не будзе грошаў.

Насіць чужую вопратку - мяняць свой лес.

Калі часта губляюцца або дзесьці забываюцца ключы ад хаты - чакай крадзяжу.

Калі жанчына бясплодная - трэба пасадзіць дома фікус, а ў ваду паставіць галінку вярбы.

Калі маці жадае шчасце сваёй дачцэ, і хоча каб яна вышла замуж, то нельга у хаце вырошчваць кактус.

Пад курыцу кладуць да 13 яек і на кожным трэба намаляваць крыж, каб усе піскляты выйшлі

*Галіна Ігнацьеўна Ломыш в. Лужкі, 2003г..*

Калі хтосьці прадае парася, ягнёнка ці курыцу на расплод і садзіць іх у мяшок, трымаючы за заднія ногі галавой наперад - у яго гэтыя жывёлы перавядуцца, а ў пакупніка распладзяцца; калі ж ён саджае іх заднімі нагамі, то яму будзе добра, але тады ў пакупніка не будзе прыплоду. А каб нікога не пакрыўдзіць, трэба жывёлу ў мяшок садзіць спіною.

Калі прадаеш карову ці каня, ці увогуле штосьці жывое, нельга перадаваць іх новаму гаспадару голымі рукамі - скаціна не будзе пладзіцца. У такім выпадку б'юць па руках і перадаюць купленае "касматай рукою", гэта значыць заварочваюць руку ў падол адзення, бо касматае лічыцца сімвалам багацця.

*Марыя Ігнацьеўна Галэцкая в. Лужкі, 2003 г.*

Калі цяжарная жанчына прыходзіць у дом, дзе ляжыць пакойнік, то трэба адразу глядзець на агонь свечкі, а потым на яго.

Каб дзіця было ціхім і спакойным, першы раз яго трэба пакласці на правы бок, а каб яно было шчаслівым і багатым - у ваду для першага купания пакласці сярэбраную манету.

Тую ваду, у якой купалі хлопца, вылівалі пад яблыньку (каб быў багаты), а ваду, у якой купалі дзяўчынку - пад вішню (каб была прыгожай, "краснай").

Спавіваць пасля першага купання дзяцей трэба толькі ў белае. Потым гэтыя пялюшкі і распашонкі памыць і не выкарыстоўваць іх да абраду хрышчэння. Пасля хрышчэння зноў іх памыць і больш не ўжываць. Калі ж народзіцца другое дзіця, то і спавіваць пасля першага купания І пасля хрышчэння трэба ў гэты камплект - тады дзеці будуць расці дружнымі.

Калі ў цяжарнай жанчыны дзесьці на целе ёсць барадаўкі, і яна іх хоча звесці, то гэтага рабіць нельга, бо яны ж з'явяцца на тварыку малога.

*Вера Іванаўна Ляўшыцкая в. Іванава, 2003г.*

Нельга паказваць да года дзіця ў люстэрка - яно можа захварэць на эпілепсію, пачаць заікацца, стаць санлівым.

Калі ў пакойніка адхінулася правая нага - наступным у гэтай вёсцы памрэ жанчына або хтосьці з родных памерлага, калі левая - мужчына.

Калі ў час памінальнага стала ў вакно пачне стукаць птушка (сарока трамшчыць), то гэта знак хуткай смерці кагосьці з родных.

Цяжарнай жанчыне нельга, выкручваючы бялізну, наматываць яе на руку - пупавіна закруціцца вакол шыі дзіцяці.

Калі першы раз дзіця прыложыш да левай грудзі - будзе ляўшня.

Калі ў хаце ёсць незамужняя дзяўчына, то маці не павінна садзіць высадкі (расліны на семя).

*Феафанія Антонаўна Машара в. Іванава, 2004 г.*

Калі бярэш расаду, кветкі і іншае для далейшага вырошчвання, нельга гаварыць “дзякуй”.

Калі бацян выкідвае з гнязда бацяня - будзе галодны год.

Нельга есці цераз нож або з нажа - будзеш злым і з усімі сварыцца.

Нельга наступаць на сляды чалавека, які ідзе ўперадзе цябе - адберыш у яго сілу.

*Любоў Іванаўна Казак в. Лужкі, 2004 г.*

Нельга есці, калі што-небудзь садзіш - будуць есці чэрві. Па гэтай жа прычыне нельга садзіць штосьці і ў чацвер.

Калі рассыпеш соль, трэба або засмяяцца, або 3 разы стукнуць сябе па лбу, каб пазбегнуць сваркі.

Цяжарнай жанчыне нельга піхаць нагамі жывёлу, дзіця народзіцца касматым.

Нельга за стол садзіцца трынаццатым - не пашанцуе.

Ад суроку ў кармане трэба насіць зубок часнаку або прышпіліць тры шпількі вастрыём уніз.

*Аляксандра Кірылаўна Міхайлаўна в. Лужкі, 2004 г.*

Як народзіцца маладзік і першы раз яго ўбачыш з левага боку - нядобра, а з правага - чакай поспеху і трэба перахрысціўшыся сказаць: “Млодзік свенты, тобе злота корона, а мне дай здрове”.

Трэба захаваць пупавіну нованароджаннага і даць яму каб ён яе развязаў, тады яму будзе ўсюды ўсё “развязывацца”, будзе легка ў жыцці,

Калі воўк перабяжыць дарогу - будзе поспех у справах, а калі заяц - лепш вярнуцца назад.

Кошка, седзячы на парозе, мыецца - да гасцей.

Калі незамужняя дзяўчына неакуратна падмятае падлогу, то замуж выйдзе за “рабога”.

*Зінаіда Сямёнаўна Ляўшыцкая в. Іванава, 2004 г.*

Пасля заходу сонца нельга лічыць грошы, а таксама нельга падкідываць дзіця ўверх – будзе дрэнна спаць.

Заручальныя пярсцёнкі лепш купляць у “мужчынскія” дні адначасова ў адным магазіне. І пажадана каб яны былі з гладкай паверхняй.

Нельга ніякія справы распачынаць на сход маладзіка, лепш пачакаць 3-4 дні маладзіка і смела займацца справай.

Дзіця можна вылечыць ад сурока ці плачу, пакрыўшы ягоны тварык вэлюмам.

*Вольга Іванаўна Аніськовіч в. Лужкі, 2004 г.*

# Родны край у творчасці пісьменнікаў -землякоў



## КАЦЯРЫНА СОСНА

Незвычайны ёсць куток
На маёй Айчыне:
Правіцыйны гарадок
З назвай Шаркаўшчына.

Мілы сэрцу родны край
Спадчынай багаты,
Для мяне – нібыта рай
Буднямі і ў святы.

Не стамлюся я любіць
Гэтыя мясціны,
Дзе Дзісёнка ўдаль бяжыць,
Дзе народ гасцінны.

## *Мая Шаркоўшчына*

Вясна абуджае Шаркоўшчыну.
У рытме працоўным прастора.
І водар плыве з-пад Жукоўшчыны,
З садоў, пасадзіў што Сікора.

Да твару ёй строі вясновыя,
Бы ў вэлюмах, яблыняў кроны.
І мары лунаюць ружовыя,
Яднаючы сэрцы ўлюблёных.

Абмыты расой серабрыстаю
Раслінкі, што цягнуцца ў неба.
Дзісёнка з вадою празрыстаю
Яднае аблокі і глебу.

Тут песцяцца кветкі над вокнамі,
І сонца ў гародах гуляе.
Рабіна з чырвонымі гронкамі
Руплівую восень гукае.

Радзімай малой ганаруся я,
Гадамі тут шчасце куецца.
Часцінкай маёй Беларусі
Зямлёй Шаркаўшчынскай завецца.

# ВІКТАР ЛАГУН

## *Раніца Шаркоўшчыны*

Сведка гэтаму—край сінявокі наш:
Два шляхі – што з Дзісны на Жукоўшчыну,
І з Браслаўскіх азёр на Глыбокае—
Леглі ростанню ў цэнтры Шаркоўшчыны.

На мяжы паміж вёскай і горадам
Самабытнасць яе ўсталявалася
І малюнкамі вуліц красворднымі
На ўзбярэжжы ракі праяўлялася.

З першым промнем яна прачынаецца
І ў квяцістае ўбранне ўбіраецца.
Да Дзісёнкі збягае, спускаецца
І ў люстэрка яе заглядаецца.

Я вітаю Шаркоўшчыну раніцай.
Што адкажа яна мне, -- паслухаю:
Падыходзіць да ранішняй станцыі
Па чыгунцы цягнік з перастукамі.

Ульяноўскія пеўні ад радасці
Галасамі ніяк не нахваляцца,
Не ўступаюць ім тыя, што ў Ракаўцах.
А Шаркоўшчына ж песнямі славіцца!

А найбольш, сіняй стужкай спавітая,
На ўвесь край і заўжды ганарылася
Ты сваімі людзьмі працавітымі,
Што на гэтай зямлі нарадзіліся.

Што і сёння на працу спяшаюцца.
Ім насустрач вядзе мяне вуліца.
Шаркаўшчанка з табой павітаецца, --
Быццам сонца на небе ўсміхнулася.

А сур’ёзнасць мужчын незвычайная,
Я кажу вам усім:”Добрай раніцы!” –

Карапузу з садка – шаркаўчаніну
І чародцы дзяўчат- шаркаўчаначак…

У нябёсах пад аркай вясёлкавай,
Крылы мараў і планаў спрабуючы,
Зазірае юнацтва Шаркоўшчыны
Цераз сённяшні дзень у дзень будучы…

Можаш ехаць на Браслаў з Глыбокага,
Можаш плыць па рацэ з-пад Жукоўшчыны…
НадДзісною нязгаснучай зоркаю—
Мой пасёлак
пад назвай
Шаркоўшчына.

# МІЛЕДЗІЙ КУКУЦЬ

Гэты родны мне кут.
Дарагую зямлю
Шчыра сэрцам усім
Я з маленства люблю.

Край блакітных азёр
І духмяных лугоў,
Тых шматлікіх балот
Ды цяністых лясоў.

Каласяцца ў хлябах
Залатыя палі,
Шчодрасць, моцы даюць
Нашай роднай зямлі.

Чыстым снегам іскрыцца
На сонцы зімой
Між лясоў і балот
Родны кут над Дзісной.

Далёка за вёской, дзе рунь каласіцца,
Схавала свой сонца апошні прамень.
Стаў прыцемак ціха навокал лажыцца,
Пакрыўшы фіранкай спякотлівы дзень.

Спяшаецца статак кароў чарадою,
Бягуць да варот сустракаць іх жанкі.
І вось ужо з вымя цурчаць сырадоем.
Вядро напаўняючы, два ручайкі.

Ля самае вёскі пяе касавіца,
Навостраных кос чуем мы перазвон:
З расою трава на пакосах зіхціцца,
Зямля аддае свій апошні паклон.

Заззялі на небе ўжо першыя зоркі,
У змроку ледзь бачым пракосаў зубцы.
І луг абязлждвнеў, там сціхла гамонка,
Пайшлі спачываць пасля працы касцы.

Над цёплай зямлёй пара клубіцца,
Спяваюць пяшчотна ў садах салаўі.
Ты спі, мая вёска, мая працаўніца,
Хай сняцца заўжды табе добрыя сны.

# *Мая Дзісёнка*

Бы стужка на вятры гуляе, -
Праз Шаркаўшчынскія палі
Цячэ Дзісёнка, падмывае
Свае крутыя берагі..

Зачараваны я ракою!
Няма мясціны прыгажэй,
Каля яе ў кустах вясною
Складае песні салавей.
Узрэчча ў маі заквітнее, -
Дзе ўбачыш столькі хараства!
Ад паху кветак захмялее
І пойдзе кругам галава.

Душою ў марах я лунаю,
Калі любуюся ракой.
Сваё маленства ўспамінаю
І сэрца першы непакой.

Цячэ, вірыць мая Дзісёнка
Ўначы і ўдзень, і так заўхды.
Гартае хвалі, як старонкі
Майго жыцця – мае гады…

На хвалю хвалі набягаюць,
Спяшаюцца на быстрыні,
І ранкам сонца сустракаюць
Яны ля берага Дзвіны.

# НАДЗЕЯ ПАЛЯК

## Шаркоўшчынскаму краю

Не радзілася тут, не расла,
А душою і сэрцам хінуся
Да тваёй прыгажосці, зямля, -
Мілы сэрцу куток Беларусі,

Што ў неба глядзіцца блакітам азёр,
Рассцілае дыван васільковы…
Тут парывы душы узлятаюць да зор,
Тут, як песня, -- матуліна мова.

Над Дзісною на пожнях улетку
(Ну куды той цюльпанавы стэп)
Расцвітаюць дзівосныя кветкі, -
Гэта іх маляваў тут Драздовіч Язэп.

Хай надарыцца госцю пабыць
На радзіме Машары, Сікоры,-
Гэты край ён забудзе не скора.
Слаўны край, - як яго не любіць!

Тут працуюць і песні пяюць –
Павялося здаўна так і будзе –
Услаўляючы край і зямлю,
Працавітыя шчырыя людзі.

І смачнейшага хлеба, чым тут.
Паспытаць вам нідзе не прыйдзецца.
Мілы сэрцу прыгожы мой кут
Шаркаўшчынскай старонкай завецца.

# МІХАСЬ РАЙЧОНАК

## *У Германавічах*

Роднай вёскай іду,
Снег рыпіць пад нагамі,
Словы ў верш на хаду
Падбіраюцца самі.

Ўецца лёгкі дымок
Над радзімаю хатай.
Тут пра кожны куток
Успамінаў багата.

Помню песенькі ўсе,
Што бабуля спявала.
Я ў калысцы ляжаў,
А яна калыхала.

## *Над Дзісёнкай*

Ля ног трапечацца рака,
Мая Дзісёнка.
Мне льецца ў сэрца з быстрака
Яе гамонка.

Вось чайка весела крылом
Ваду кранула.
Узняўшы пыркі, на пад’ём –
Стралою, куляй!

Чарот ля берага шуміць.
Пад ветрам гнецца,
І песня салаўя гучыць,
У сэрца льецца.

Я погляд радасны лаўлю
Радзімае старонкі.
“Люблю цябе! Люблю.. Люблю!..” –
Нясецца над Дзісёнкай.

***Зямля мая***

Зямля мая, зямля бацькоў,
Як рвуся быць з табою!
Каб удыхнуць твой водар зноў
Гаючы раніцою.

Люблю маленькі мой куток
Прыдзісненскага краю.
Лес, возера, рака, садок –
Я з вамі засынаю.

Знаёма ўсё тут да драбніц –
Каменьчыкі, сцяжынкі…
Як родная, мне шапаціць
Лістотаю галінка.

Калі ад’едуся куды,
То па табе сумую.
Старонцы любай назаўжды
Аддам сваю душу я.

***Родныя мясціны***

Я нарадзіўся ў месцы дзіўным
На беразе Дзісны-ракі,
Дзе ўлетку ў пышнай зеляніне
Яе крутыя берагі.

Дзе крыкі кані над лугамі
І дзе бяскрайнія палі
Сяьруюць з сінімі лясамі,
Дзе звоняць срэбрам ручаі.

Мая на небе свеціць зорка
Там, дзе Драздовіч вандраваў
І дзіўныя свае узоры
На памяць людзям пакідаў.

Там, дзе на ўзгорку над Дзісёнкай
Касцёл з сівых гадоў стаіць.
Дзе парк вядзе сваю гамонку,
Пад ветрам лісцем шапаціць.

Я ў гэтым месцы нарадзіўся
У белай хаце ля дубоў,
Дзе ўвесну вёска тоне дзіўна
У белай кіпені садоў.

Моё село зовут Ручьём,
Тепло и ласково зовут
За тишину, за глубину,
За невзыскательный уют.

И за распахнутое небо,
За вескую весомость слов,
За то, что зори пахнут хлебом,
За откровенье соловьёв.

Моё село, моя основа,
Его не зря Ручьём решили звать.
Народ умеет тёплым словом
О нём всем сердцем рассказать.

Моё село – село родное,
Ты год от года всё родней
Да будет мир и хлебосолье
Под каждой крышею твоей.

## Спіс літаратуры:

1. Віцебшчына: Назвы населеных пунктаў паводле легенд і паданняў /Склад., запіс, апрац. А.М. Ненадаўца.– Мн.: Беларусь, 2000. – 478 с.: іл. - (Мой родны кут).

2. Капылоў У., Родныя тапонімы: (пра паходжанне вёскі Радзюкі)/ Уладзімір Капылоў// Звязда. – 2013.—3 снежня. – С.8

3. Лыч Л.М., Назвы зямлі беларускай -- Мінск: Універсітэцкае, 1994.-- 128с

4. Материалы по истории и географии Дисненского и Вилейского уездов Виленской губерни. - Витебск: Губернская типолитография, 1896. – 124с.

5. Памяць: Гістарычна-дакументальная хроніка Шаркаўшчынскага раёна.- Мн.: БелТА, 2004.- 512с., іл.

6. Шарковщина. Шарковщинский район: Прошлое, настоящее, события, люди.- Мн.: Бонем, 1999. - 27с., ил.